Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЛІПЕНЬ 8 1933 г. СУБОТА № 148 (4692)

Год выданьня XVI

МОСКВА, Старая Площадь 4
ЦК ВКП(б) газетному Сектору
АПШО
инв. дек. | Зьв.-2 |

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ:

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Рашучы адпор антымэханізатарскім тэндэнцыям. Разгорнутая праграма ўздыму транспарту. В-СКІ — У барацьбе за пралетарскі інтэрнацыяналізм (2 стар.). Н. ЦЯРЗНЬЦЯЎ — Войны эканамічныя і звычайныя (3 стар.).

АБ САЎГАСЕ ПАЧАЕВІЧЫ — Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б ад 7 ліпеня 1933 г. (1 стар.).

АДОЗВА ЗЬЛЁТУ КАЛГАСЬНІЦ-УДАРНІЦ МЕНСКАГА РАЁНУ ДА ЎСІХ КАЛГАСЬНІЦ МЕНШЧЫНЫ І БССР. (1 стар.).

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА — Чыстка партыі ўзьнімае творчую ініцыятыўнасьць рабочых мас (2 стар.).

Лісты рабочых і калгасьнікаў (2 стар.).

ЗА МЯЖОЙ

Нелегальная «РОТЭ ФАНЭ» ахвотна чытаецца рабочымі Берліну (4-я стар.).

«Сталёвы шлём» поўнасьцю падпарадкаваўся Гітлеру (4 стар.).

Рашучы адпор антымэханізатарскім тэндэнцыям

Першая ўсебеларуская нарада дырэктароў МТС павінна зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу на пытаньні **МЭХАНІЗАВАНАЙ ІЛЬНАЎБОРКІ.**

Шкодніцкі, якія арудавалі ў органах Наркамзему і Трактарацэнтру, добра ўлічвалі якое вялікае значэньне для сацыялістычнага ільнаводзтва мае мэханізацыя ўборачных работ.

І адсюль іх тактыка — сарваць ва што-б там ні стала мэханізацыю ільнаўборкі. Асноўным аб'ектам шкодніцкай практыкі была выбрана ільнацерабілка «Камсамолка». І гэта зусім зразумела. «Камсамолка» рашуча паскарае тэмпы і паляпшае якасьць ільнаўборкі, вызваляючы значную колькасьць рабочых рук, што, натуральна, ніяк не ўваходзіла ў пляны шкоднікаў.

Дыскрэдытаваць ільнацерабілку, даказаць яе «нерэнтабэльнасьць», сарваць падрыхтоўку кадраў — вось чаго дамагаліся шкоднікі.

Так нарадзілася контр-рэвалюцыйная легенда аб «нерэнтабэльнасьці» ільнацерабілак. У нас — у БССР гэта легенда пусьціла асабліва глыбокія карэньні.

Успомнім, як былы кіраўнік вытворчага аддзелу Трактарацэнтру Тарасаў (расстрэляны паводле пастановы калегіі АДПУ), адкрыта заяўляў, што «ільнацерабілкі не працавалі і працаваць ня будуць».

У мінулым годзе ў БССР шкодніцкі ня былі скарыстаны 90 проц. усіх завезоных ільнацерабілак. Падрыхтоўка кадраў таксама была сарвана. Замест 2.700 ільнацерабільшчыкаў было падрыхтавана толькі 600.

Шкоднікі выкрыты і разгромлены. Цэнтральны Камітэт КП(б)Б і Саўнарком рашуча падкрэслілі необходнасьць яшчэ больш узмацніць клясавую пільнасьць і бязьлітасна выкрываць малейшыя рэцыдывы контр-рэвалюцыйных разважаньняў аб «нерэнтабэльнасьці» ільнацерабілак.

Нажаль, сумныя ўрокі мінулага году яшчэ поўнасьцю **НЯ ЎЛІЧАНЫ.** Рэшткі шкодніцкага ахвосьця прабуюць ня толькі адрадзіць сваю антысавецкую легенду, але і на практыцы затармазіць мэханізацыю ільнаўборкі.

Вось, напрыклад, паслухайце да якіх вывадаў прышлі кіраўнікі МТС Асьвейскага раёну.

У спэцыяльным акце, як паказваюць матар'ялы, атрыманыя рэдакцыяй, гаворыцца:

«Ільнацерабілкі параўнальна з ручным цераблеьнем зьяўляюцца **МАЛА ЭФЭКТЫЎНЫМІ** ў сельскай гаспадарцы».

І гэта ў той час, калі вопыт перадавых калгасаў БССР паказаў, што пакат у першы перыяд работы на ільнацерабілках, калі яны яшчэ ня былі выстарчальна асвоены. «Камсамолкі» **ПАВЯЛІЧЫЛІ ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦЬ ПРАЦЫ Ў ЧАТЫРЫ РАЗЫ ПАРАЎНАЛЬНА З РУЧНЫМ ЦЕРАБЛЕНЬКЕМ.**

Вораг разумее, што адкрыта выступаць супроць мэханізацыі ільнаўборкі нельга і проста небясьпечна. У ход пускаецца тактыка «ціхай сапы». Выкідваецца своеасаблівы лёзунг:

— Вельмі добрая рэч гэтыя ільнацерабілкі, але ў Беларусі яны непатрэбны.

І трэба проста сказаць, што Ільнатрактарацэнтр БССР і кіраўнікі вельмі многіх ільнаводчых МТС апынуліся ў палоне антымэханізатарскіх настрояў, павелічых клясавым ворагам.

Адмаўленьне ад ільнацерабілак (а хіба гэта ня яўнае адраджэньне контр-рэвалюцыйнай легенды аб іх «нерэнтабэльнасьці»?) набыло ў нас сур'ёзныя разьмеры.

Возьмеце, напрыклад, **ЛЕЗЬНЯНСКУЮ МТС.** Яна павінна атрымаць з Бешанковіч 15 ільнацерабілак. У распараджэньні МТС ёсьць аўтамашына. Да Бешанковіч вядзе добрая шаша. Дастаўка ільнацерабілак зойме зусім пяцьнаднi час. МТС, аднак, не забірае ільнацерабілкі і па сёньняшні дзень. І гэта ў той час, калі ў раёне трэба ўбраць звыш 12 тысяч гектараў ільну.

Дырэктар **МСЬЦІСЛАЎСКАЙ МТС** катэгарычна адмовіўся забраць 20 ільнацерабілак, прызначаных для гэтай МТС. **КРУПСКАЯ МТС** не забірае 20 ільнацерабілак. **БЯЛЫНІЦКАЯ** — 5 і г. д. і г. д.

Факты можна памножыць, але і сказанага даволі, каб пераканацца, наколькі яшчэ нязломлены антымэханізатарскія настроі.

Гэта ня ўсё. **КАДРЫ і РАМОНТ** — у самым нездавальняючым пагражаючым стане. Плян рамонту ільнацерабілак выканан толькі на 69,8 проц. ільнамалатарні «Эдзі» адрамантаваны ўсяго на 66,2 проц., ільнамашыны Гільштэйна — на 67 проц. і г. д.

Але ільнацерабілка, да таго ж, сама ня пойдзе. Патрэбен добры спраўны трактар. Ільнатрактарацэнтр БССР, аднак, з 766 трактараў адрамантаваў пакуль толькі 6 (шэсьць!). У наяўнасьці найвялікшы **РАЗРЫЎ** паміж рамонтам трактараў і рамонтам ільнацерабілак. Гэта ў канчатковым лёсу можа прывесьці да дыскрэдытацыі ільнацерабілак. Вядома, што ільнацерабілка на коннай цязе дае значна меншую эфэктыўнасьць, чым ня трактарнай.

Асобна аб кадрах. Замест 2.800 ільнацерабільшчыкаў пакуль падрыхтавана толькі **1.394.** Але і гэтай лічбе нельга верыць. Ніякага кантролю над падрыхтоўкай кадраў няма. Хто вучыцца на курсах, іх сацыяльны твар, як выконваюцца навучальныя праграмы — **НЕВЯДОМА.**

А факты з месц прымушаюць біць трывогу. Даволі ўказаць, што Бялыніцкая, Мехаўская і іншыя яшчэ не падрыхтавалі ні аднаго ільнацерабільшчыка.

Паданыя факты з усёй сілай сыгналізуюць, што антымэханізатарскія настроі яшчэ ня зломлены, што посьпех мэханізаванай ільнаўборкі стаіць пад ударам.

Першая ўсебеларуская нарада дырэктароў МТС павінна да канца выкрыць канкрэтных посьбітаў контр-рэвалюцыйнай легенды аб «нерэнтабэльнасьці» ільнацерабілкі.

Прыняўшы ў баявую гатоўнасьць усе да адной ільнацерабілкі і трактарны парк, падрыхтаваць кадры ільнацерабільшчыкаў з лепшых праверэных калгасьнікаў-ударнікаў — вось задача, якую павінна практычна вырашыць нарада.

Партарганізацыі і палітаддзелы МТС павінны арганізаваць жалезны адпор антымэханізатарскім настроям, апартуністычнай недаацэнцы мэханізаванай уборкі ільну.

Задача заключаецца ў тым, каб правільна спалучыць ручную ўборку з тэй высокай машыннай тэхнікай, якую атрымалі нашы ільнаводчыя калгасы праз МТС, забясьпечыўшы **СВАЯЧАСОВУЮ І ПОЎНУЮ ЗДАЧУ ІЛЬНАПРАДУКЦЫІ ДЗЯРЖАВЕ!**

Аб змазачных матар'ялах для уборачных машын

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б ад 5-VII-33 г.

1. Прапанаваць Наркамзему, Трактарацэнтрам і ўпаўнаваженым Наркамзаўгасу пад асабістую адказнасьць т. т. Стрэле, Селіванa, Дубоўскага, Грабенчыка і Сьмірнова ў пяцідзённы тэрмін прадставіць упаўнаважанаму Нафтагандлю па БССР т. Гайда плян спажываньня змазачных матар'ялаў для ўборачнай кампаніі і малацьбы ў разрэзе саўгасаў, МТС і калгасаў па пунктах снабжэньня (складах Саюзнафтагандлю).

2. Абавязаць ўпаўнаважанага Нафтагандлю па БССР т. Гайда, на падставе прадстаўленага Наркамзем і Упаўнаважанага Саўгасаў пляну спажываньня змазачных маслаў для сельгасмашын, поўнасьцю забясьпечыць завоз гэтых змазачных матар'ялаў у БССР.

3. У мэтах бесьперабойнага снабжэньня машын змазачным матар'ялам у часе іх працы абавязаць райспажыўсаюзы на час уборачнай кампаніі і малацьбы мець у сваіх крамах (сельСТ) машынныя масла і інш. змазачныя матар'ялы для сельска-гаспадарчых уборачных машын і малатарняў.

4. Абавязаць т. Гайда даць дырэктыву свайм складам бесперабойна снабжаць крамы райспажыўсаюзаў паказанымі змазачнымі матар'ялами.

5. Прапанаваць Трактарацэнтрам, саўгастрэстам і калгасам скарыстоўваць машынныя масла для змазкі больш адказных мэханізмаў сельгасмашын, а змазку менш адказных частак машын рабіць змазачнымі мазутамі.

6. У сувязі з тым, што значная частка МТС і саўгасаў ужываюць для змазкі сельгасмашын і інвэнтару адпрацаваныя аўтолы, якія па пастанове СПА павінны здавацца складам Нафтагандлю, забараніць скарыстаньне МТС і саўгасамі адпрацаваных аўтолаў для сельгасмашын і інвэнтару і абавязаць дырэктарыў МТС і саўгасаў і старшынь калгасаў адпрацаваныя аўтолы здаць поўнасьцю складам Нафтагандлю.

Сакратар ЦК КП(б)Б ШАРАНГОВІЧ

Адкрылася ўсебеларуская нарада дырэктароў МТС

Учора ўвечары адкрылася ўсебеларуская нарада дырэктароў МТС збожжавага, ільнянага і бульбяна-плодагародняга Трактарацэнтраў.

Нарада заслухала даклад народнага камісара земляробства БССР тав. БЭНЭКА, аб вынніках веснавой сяўбы, задачах уборачнай і пастаўцы збожжа дзяржаве. Тав. Бэнэк ускрыў перад нарадай усе дасягненьні і недахопы работы МТС за час пасеўнай кампаніі і заклікаў нараду да ўдарнаму змаганьню з пяршынства ў сацыялістычным спаборніцтве з Заходняй вобласьцю.

БССР, — КАЖА ТАВ. БЭНЭК, — МАЕ ЎСЕ ЎМОВЫ НЯ ТОЛЬКІ УТРЫМАЦЬ ЗА САБОЙ ПЯРШЫНСТВА, ЗАВАЯВАНАЕ Ў ЧАСЕ ПАСЕЎНАЙ, АЛЕ І ВЫЙСЬЦІ ПЕРАДАВІКАМІ НА ТАКІХ ВАЖНЕЙШЫХ ВУЧАСТКАХ, ЯК УБОРАЧНАЯ І ПАСТАЎКІ С. Г. ПРАДУКЦЫІ ДЗЯРЖАВЕ».

Вячэрняе паседжаньне закрылася выступленьнем начальніка палітсэктару НКЗБ тав. ПЫЖЫКАВА, які коратка асьвятліў ход арганізацыі палітаддзелаў у МТС і задачах МТС у барацьбе за бальшавіцкія калгасы.

Нарада аднадушна прыняла пастанову аб пасылцы прывітальных тэлеграм т. т. СТАЛІНУ, МОЛАТАВУ, ЦК КП(б)Б т. ГІКАЛО і СНК БССР тав. ГАЛАДЗЕДУ.

Сёньня дэлегаты будуць працаваць пры сваіх цэнтрах, пасьля чаго зноў адбудзецца сумеснае заключнае паседжаньне.

НА ПАРОЗЕ УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ

Рапартаваць зьезду бальшавіцкай падрыхтоўкай да ўборкі і пастаўкі збожжа

Да ўсіх калгасьніц Меншчыны, да ўсіх калгасьніц БССР

Мы калгасьніцы-ўдарніцы перадавых калгасаў і брыгад Менскага раёну, сабраўшыся на раённы зьлёт калгасьніц - ударніц, абмеркаваўшы вынікі першай сяўбы другой пяцігодкі, нашы задачы па праполцы, уборцы і здачы збожжа, бульбы і іншых с.-г. прадуктаў дзяржаве, зварачаемся да вас, калгасьніцы Менскага раёну, да вас, калгасьніцы Савецкай Беларусі.

Веснавую сяўбу калгасы нашага раёну скончылі **НА 25 ДЗЁН РАНЕЙ** і лепш па якасьці, чым у мінулым годзе. Гэтыя посьпехі заваяваны калгасьнікамі нашага раёну пад правільным бальшавіцкім кіраўніцтвам нашай партыі. Наша слаўная ленінская партыя робіць усё для таго, каб палепшыць нашу калгасную жыцьцё, робіць усё для таго, каб зрабіць нашы калгасы бальшавіцкімі і калгасьнікаў заможнымі.

Убярэм ураджай бяз страт

Мы скончылі сяўбу, але мы добра ведаем, што гэтым не канчаецца барацьба за высокі ўраджай, гэтым не канчаецца барацьба за бальшавіцкія калгасы. Перад намі стаіць яшчэ больш адказная задача— **МЫ ПАВІННЫ ЗАМАЦАВАЦЬ ПОСЬПЕХІ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ І МЫ ІХ ЗАМАЦУЕМ УЗОРНЫМ ПРАВЯДЗЕНЬНЕМ ПРАПОЛКІ, УБОРКІ І ЗБОЖЖАЗДАЧЫ.** Жанчына ў часе праполкі і ўборкі адыгрывае выключна вялікую ролю. Нашым лёзунгам павінна быць — ні адна працаздольная жанчына ў часе праполкі і ўборкі не павінна заставацца дома. Усе павінны працаваць. Хто не працуе, або працуе нядобрасумленна, таму з намі не па дарозе, таму няма месца ў працоўнай калгаснай сям'і.

Трэба проста прызнацца, што з праполкай збожжавых мы спраўляемся кепска. У гэтым мы самі вінаваты. Даволі ўказаць, што Бялыніцкая, Мехаўская і іншыя яшчэ не падрыхтавалі ні аднаго ільнацерабільшчыка.

Паданыя факты з усёй сілай сыгналізуюць, што антымэханізатарскія настроі яшчэ ня зломлены, што посьпех мэханізаванай ільнаўборкі стаіць пад ударам.

Першая ўсебеларуская нарада дырэктароў МТС павінна да канца выкрыць канкрэтных посьбітаў контр-рэвалюцыйнай легенды аб «нерэнтабэльнасьці» ільнацерабілкі.

Прыняўшы ў баявую гатоўнасьць усе да адной ільнацерабілкі і трактарны парк, падрыхтаваць кадры ільнацерабільшчыкаў з лепшых праверэных калгасьнікаў-ударнікаў — вось задача, якую павінна практычна вырашыць нарада.

Партарганізацыі і палітаддзелы МТС павінны арганізаваць жалезны адпор антымэханізатарскім настроям, апартуністычнай недаацэнцы мэханізаванай уборкі ільну.

Задача заключаецца ў тым, каб правільна спалучыць ручную ўборку з тэй высокай машыннай тэхнікай, якую атрымалі нашы ільнаводчыя калгасы праз МТС, забясьпечыўшы **СВАЯЧАСОВУЮ І ПОЎНУЮ ЗДАЧУ ІЛЬНАПРАДУКЦЫІ ДЗЯРЖАВЕ!**

Будзем чыста жаць і ўсё зжатае зьвязваць у снапы. Даб'ёмся, каб былі прыстасаваны зерняўлоўнікі да кожнай жнівяркі.

Мы павінны і будзем змагацца нароўні з мужчынамі-ўдарнікамі, каб быў парадак, каб калгасы сталі сапраўды бальшавіцкімі.

Для таго, каб сьвезьці збожжа з поля, для таго, каб яго апрацаваць, трэба мець добрую тару. Мы абавязваемся падрыхтаваць мяшкі, дзаругі. Арганізуем у брыгадах пільную праверку наяўнасьці тары і поўнасьцю прыняздзем яе ў парадак. Будзем зграбаць калосьсе пасьля жніва. Для гэтай работы прыцягнем нашых дзяцей. Для таго, каб зерне не рассыпалася пры перавозцы з поля, мы падрыхтуем подсьцілкі для калёс.

Мы арганізуем строгі прамадзкі кантроль, ахову нашай калгаснай уласнасьці з тым, каб кулакі і злодзеі не раскрадвалі нашага ўраджаю. Мы яго будзем ахоўваць на корні, пры ўборцы, малацьбе і ў сьвірнах. Арганізуем брыгады бракоўшчыкаў, якія будуць сачыць за якасьцю работы кожнага паасобку.

Ці можна ўсё гэта зрабіць? Бязумоўна можна і мы гэта зробім. Для таго, каб забясьпечыць выхад усіх жанчын у поле, арганізуем бесьперабойную работу ясьляй, дзіцячых садоў. Арганізуем таксама сталоўку ў кожным калгасе і падвозку абедаў на поле ў часе работы.

Дзяржаве—у першаю чаргу

Калгасьніцы, мы ад нашай дзяржавы атрымалі ўсё неабходнае для таго, каб нам добра жылося. Было-б несправядлівасьцю з нашага боку, калі-б мы задягнулі здачу збожжа, бульбы і іншых сельска-гаспадарчых прадуктаў, якія мы павінны здаць па абавязацельствах нашай роднай сацыялістычнай дзяржаве.

Мы лічым **ЗАДАЧУ АКУРАТНАГА І СВАЯЧАСОВАГА ВЫКАНАНЬНЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ ПЕРАД ДЗЯРЖАВАЙ — НАЙПЕРШЫМ АБАВЯЗКАМ КОЖНАГА КАЛГАСУ, КАЛГАСЬНІКА, КАЛГАСЬНІЦЫ, ПРАЦОЎНАГА-АДНААСОБНІКА І АДНААСОБНІЦЫ.**

Гэта задача павінна стаяць упераДзе ўсіх іншых задач. Мы павінны за гэта з усёй настойлівасьцю змагацца. Без першачарговага і поўнага выкананьня кожным калгасам сваіх абавязацельстваў — няма і ня можа быць сапраўднага арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў замежнага жыцьця калгасьнікаў. З першага-ж абмалоту першага снопу здамо дзяржаве збожжа.

Калгасьнікі **ТРАСЬЦЯНЕЦКАГА** сельсавету ўзялі на сябе абавязацельства здаць дзяржаве поўнасьцю збожжа на шосты дзень пасьля абмалоту, звезьці яго чырвоным абозам на дзяржаўныя склады.

Мы прымаем —выклік калгасаў Трасьцянецкага сельсавету. Мы абавязваемся бязумоўна выканаць гэту задачу. Справай гонару для ўсіх нас зьяўляецца выкананьне абавязацельстваў перад дзяржавай у першую чаргу, і мы гэта бязумоўна выканаем.

Бульбу таксама будзем вазіць з поля на ссыпныя пункты. Выканаем поўнасьцю здачу бульбы па абавязацельствах не пазьней 1 кастрычніка.

Для выкананьня гэтых задач у нас ёсьць усе магчымасьці. Трэба толькі па-бальшавіцку ўзяцца за арганізацыю ўборкі, даць рашучы адпор кулаку і падкулачніку, якія прабуюць і будуць прабаваць усякімі мэтадамі зрываць уборку і збожжаздачу дзяржаве.

Будзем весьці рашучую барацьбу з лодырамі і прагульшчыкамі, жадаючымі пажывіцца за чужы кошт. Бязьлітасная барацьба павінна быць абвешчана зрыўшчыкам працоўнай дысцыпліны і раскрадвальнікам грамадзкай уласнасьці.

Не здамо пяршынства

Калгасы Менскага раёну спаборнічаюць з калгасамі Смаленскага, Віцебскага і Гомельскага раёнаў. У сяўбе мы заваявалі пяршынства. Заваюем-жа пяршынства і ў правядзеньні ўборкі і датэрміновай здачы збожжа, бульбы і іншых сельска-гаспадарчых прадуктаў па абавязацельствах дзяржаве. Яшчэ шырэй разгорнем сацыялістычнае спаборніцтва па ўборцы. Мы цьвёрда ўпэўнены, што наш выклік будзе падхоплен усімі калгасьнікамі, і калгасьніцамі, адналасобнікамі і адналасобніцамі Менскага раёну і ўсёй Беларусі. Мы павінны і можам заваяваць пяршынства ў спаборніцтве з калгасьнікамі Заходняй вобласьці.

Пад кіраўніцтвам ЦК і Менгаркому КП(б)Б на чале з вытрыманым стойкім бальшавіком-ленінцам тав. **ГІКАЛО** даб'ёмся таго, каб гэты год быў апошнім годам цяжкасьцей.

Наш зьлёт адбываецца напярэдадні скліканьня другога ўсебеларускага зьезду калгаснікаў-ударнікаў і напярэдадні XIII гадавіны вызваленьня Беларусі ад белапалякаў. Мы абавязваемся сустрэць зьезд і гадавіну вызваленьня ад уціску памешчыкаў і капіталістаў новым уздымам энтузіязму ў барацьбе за пясьляховае правядзеньне праполкі і ўборкі.

Мы вітаем пастанову ЦК УсеКП(б) аб вылучэньні жаногаў пры палітаддзелах МТС. Гэта яшчэ больш узьніме работу сярод жанчын-калгасьніц, павысіць іх актыўнасьць у барацьбе за бальшавіцкія калгасы.

Наперад, да новых перамог!

Няхай жыве наш верны кіраўнік — ЦК УсеКП(б), на чале з любімым правадыром партыі і сусьветнага пралетарыяту тав. **СТАЛІНЫМ!**

Няхай жыве ЦК КП(б)Б на чале з загартаваным бальшавіком тав. **ГІКАЛО!**

Аб саўгасе Пачаевічы

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б ад 7 ліпеня 1933 г.

Заслухаўшы інфармацыю нач. палітаддзелу саўгасу Пачаевічы тав. СТЭРНІНА і сакратара Чашніцкага РК КП(б)Б тав. ІЎРЫ, сакратарыят ЦК КП(б)Б канстатуе, што пралезьшыя ў гаспадарчае, прафсаюзнае і партыйнае кіраўніцтва саўгасу Пачаевічы буржуазныя перараджэнцы і разпажышыяся элемэнты (Ляўшоў, Вільчак, Кучынскі, Галгоўскі, Шыдлоўскі) свайй злачынай безгаспадарчасьцю паставілі саўгас перад простай папрозай зрыву веснавой сяўбы, дапусьцілі вялізарны адыход пагалоўя сьвіней і парасят (63 проц. усяго пагалоўя), разбазарвалі кармы і таварную прадукцыю, ігнаравалі матар'яльна-бытавыя патрэбы рабочых, груба зацісканючы самакрытыку і прыкрываючы сваю работу сыстэматычным «очковтирательством».

Неаднаразовыя сыгналы камуністаў і рабочых, паступаўшыя яшчэ ў 1932 г. у раённыя арганізацыі, сустрэлі там бяздушна-бюракратычныя адносіны. Рэдакцыя раённай газэты, утаіўшы веснуныя факты з ліста рабочых у рэдакцыю ў пачатку сьнежня 1932 г., патурала далейшай злачыннай безгаспадарчасьці і зацісканьню самакрытыкі ў саўгасе, а старшыня райКК Седлераў пры выездах у саўгас аказваў простае падтрыманьне разпажышымуся кіраўніцтву саўгасу ў зацісканьні самакрытыкі. У выніку такіх-жа бяздушна-бюракратычных адносін да сыгналаў рабочых, спэцыяльная камісія РК, на чале з загоргам Асіпавым абышла маўчаньнем факты грубага зацісканьня самакрытыкі і ня ўскрыла «очковтирательства» і разбазарваньня прадукцыі. Усё гэта сьведчыць аб тым, што бюро РК не забясьпечыла канкрэтнага кіраўніцтва палітычным і вытворчым жыцьцём саўгасу.

Усе факты злачыннай безгаспадарчасьці, «очковтирательства» і зацісканьня самакрытыкі былі ўскрыты толькі палітаддзелам саўгасу Пачаевічы.

Сакратарыят ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Ухваліць пастанову РК і РКК ад 29 чэрвеня аб выключэньні з партыі былых кіраўнікоў саўгасу — дырэктара ЛЯЎШОВА, нам. дырэктара ВІЛЬЧАКА, сакратара парт'ячэйкі КУЧЫНСКАГА, старшыні рабочкому ГАЛГОЎСКАГА, кладаўшчыка ШЫДЛОЎСКАГА, прапанаваўшы пракурору рэспублікі прыцягнуць іх да судовай адказнасьці.

2. Зьняць з работы рэдактара газэты «Шлях сацыялізму» ХУШЧЭНСКАГА і прасіць ЦКК разглядзець пытаньне аб яго партыйнасьці.

3. Зьняць з працы заг. аргаддзелам РК АСІПОВА, абвясьціўшы яму суровую вымову.

4. Прасіць ЦКК разглядзець пытаньне аб партыйнай адказнасьці былога старшыні КК-РОІ СЕДЛЕРАВА.

5. Паказаць сакратару РК ІЎРЫ, што, ня гледзячы на палітычна-правільную ацэнку кіраўніцтва саўгасам, ён не дабіўся своечасовага і да канца ўскрыцьця і зьнішчэньня наяўных бяспечнікаў.

6. За антыпартыйны выпад супроць палітаддзелу саўгасу зьняць з работы заг. культпропам РК КАГАНА і абвясьціць яму суровую вымову.

7. Абавязаць Упаўнаркамсаўгасаў (тав. Жолудава) накіраваць у трохдзённы тэрмін для пастаяннай працы ў саўгасе Пачаевічы кваліфікаванага агранома — нам. дырэктара саўгасу, забясьпечыць далейшае ўзмацненьне тэхнічнымі кадрамі, забясьпечыць да пачатку ўборкі пасылку грузавой машыны, жнівярак, запчастак, спэцыяльна разглядзеўшы пытаньне аб захадах да аздаравленьня фінансовага становішча саўгасу і скончаньня да восені жыльбудаўніцтва для рабочых саўгасу.

8. Улічваючы рад сыгналаў аб нездавальняючым кіраўніцтве саўгасамі Аршанскага трэсту і аб скрыўленьні партыйнай лініі ў практычнай рабоце заслухаць на адным з бліжэйшых пасяджэньняў бюро ЦК даклад Аршанскага трэсту.

9. Даручыць аргінструктару і культпропу ЦК забясьпечыць у бліжэйшыя дні пасылку ў Чашніцкі раён заг. аргаддзелам і культпропам РК.

10. Абавязаць Упаўнаркамсаўгасаў (тав. Жолудава) у пяцідзённы тэрмін даслаць у саўгас Абрубы-Чысьцік камісію для глыбокага абсьледаваньня ўсяго становішча саўгасу, неадкладна накіраваўшы туды новага дырэктара.

11. Даную пастанову ЦК КП(б)Б абгаварыць на аб'яднаным пленуме РК і РКК.

Рабочыя і ІТР чыгунак сустрэлі пастанову СНК і ЦК з вялікім уздымам

Сакратару ЦК КП(б)Б т. Іванову, рэдакцыям газэт „Зьвязда" і „Рабочий"

ВІЦЕБСК. (Па тэлеграфу)

Пастанова СНК СССР і ЦК УсеКП(б) «аб рабоце чыгуначнага транспарту» рабочымі і ІТР Віцебскага вузлу і раёну сустрэта з вялікім уздымам. На сходах і мітынгах рабочых і ІТР пастанова ўхвалена і вызначан рад практычных мерапрыемстваў па ўзьнаўленьні і паляпшэньні работы. Рабочыя і ІТР абавязаліся ў самы найкарацейшы тэрмін па бальшавіцку рэалізаваць пастанову СНК і ЦК. Паступіў ужо рад заяў ад ІТР аб перакідцы для работы ў нізавыя вытворчыя адзінкі.

Рад адказных работнікаў мабілізован на лінію для прапрацоўкі пастановы. 6 ліпеня склікаецца нарада парткалектываў і ячэек раёнаў па гэтых пытаньнях. Прапрацоўка праходзіць пад лёзунгам баявой падрыхтоўкі да асеньня-зімовых перавозак, поўнага аздараўленьня вагоннага і паравознага паркаў, рамонту шляху, 100 проц. сьледаваньня цягнікоў згодна раскладу. Мабілізавана для гэтай мэты і рабкораўская маса.

Намесьнік парторга 6 раёну МББ КАЗІНІК.

Адказны рэдактар газ. «Сац. Транспарт» БАСІН.

РАЗГОРНУТАЯ ПРАГРАМА ЎЗДЫМУ ТРАНСПАРТУ

Вялізарнай важнасьці задачы пастаўлены перад чыгуначным транспартам у бягучым годзе. Рост эканамічнай магутнасьці краіны, нябывалы ўздым дабрабыту працоўных мас абумовіў далейшае павялічэньне разьмераў грузазвароту.

Перавезьці ў бягучым годзе чыгункай 300 мільёнаў тон грузу — такое баявое заданьне партыі і ўраду. Ад выкананьня яго залежыць посьпех работы ўсіх галін народнай гаспадаркі.

Усім памятны ўрокі восені 1931 году, калі зрыў пляну перавозак чыгуначным транспартам пацягнуў за сабой зьнижэньне тэмпаў работы раду галін прамысловасьці. Узаемазалежнасьць паміж работай транспарту і прамысловасьці зусім відавочная.

Выключная роля чыгункі і як сродку ўзмацненьня сувязі паміж горадам і вёскай. Уладзімер Ільіч Ленін з гэтага поваду гаварыў: «ЧЫГУНКІ — ГЭТА ГВОЗД, ГЭТА АДНО З ПРАЯЎ САМАЙ ЯРКАЙ СУВЯЗІ ПАМІЖ ГОРАДАМ І ВЁСКАЙ, ПАМІЖ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЮ І ЗЯМЛЯРОБСТВАМ, НА ЯКОЙ ЦАЛКАМ ГРУНТУЕЦЦА САЦЫЯЛІЗМ».

Дрэнная работа чыгункі дае сябе адчуваць на заводах і фабрыках, на будоўлях і сацыялістычных палёх, куды часта несвоечасова даходзяць сельска-гаспадарчыя машыны, угнаеньні, пасеўныя і ўборачныя грузы. Ясна роля чыгунак і для абароназдольнасьці і для перанясеньня культуры ў вёску.

Вось чаму партыя і ўрад зварачаюць вялікую ўвагу чыгуначнаму транспарту. За апошнія гады дасягнуты бясспрэчныя посьпехі. Чыгунка выведзена з таго глыбокага прарыву, у якім была. Аднак, і да гэтага часу яшчэ ня зжыта адставаньне ад патрабаваньняў сацыялістычнага будаўніцтва. Пляны перавозак ня выконваюцца, дысцыпліна на вышыні, павялічан лік здарэньняў і інш.

У сьвятле грандыёзных задач, пастаўленых зараз перад транспартам, апублікаваная пастанова СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ад 3 ліпеня «аб рабоце чыгуначнага транспарту» мае гістарычнае значэньне.

«СНК Саюзу ССР і ЦК УсеКП(б), гаворыцца ў пастанове, лічаць галоўнай прычынай зусім нездавальняючай работы чыгунак — недахопы кіраўніцтва, недахопы арганізацыйнага характару, усё яшчэ ня зжыт канчаткова збанкрутаваўшы канцылярска-бюракратычны мэтад кіраўніцтва чыгункамі, пачынаючы ад раёнаў і дырэкцый і канчаючы цэнтральнымі кіраўніцтвамі НКШЗ».

Сапраўды, што мы мелі да гэтага часу? Разбухшыя апараты раённых кіраўніцтваў, з шматлікімі функцыямі і аддзеламі, якія фактычна ператварыліся ў маленькія дзяржкі і перашкаджалі цэнтралізаванаму кіраванню дарогай. Даволі сказаць, што апарат Райкіраўніцтва ў сярэдняй даходзіў да 250 чал. (У Віцебску — 276). Кожны множыў абежнікі, загады, а між тым апэрацыйнае кіраўніцтва, дапамога, праверка выкананьня адсутнічала.

Паводле пастановы СНК і ЦК раёны рэарганізуюцца, іх функцыі абмяжоўваюцца РЭГУЛІРОЎКАЙ РУХУ.

Новая абстаноўка і новыя задачы гаспадарчага будаўніцтва патрабуюць карэннай перабудовы работы, жывога апэрацыйнага кіраўніцтва, а не паперова-бюракратычнага. Правільная арганізацыя зарплаты, зьнішчэньне дробна буржуазнай ураўнілаўкі, правільнае ўстанаўленьне норм і расцэнак, умацаваньне адзіначальня, разгорнутая па пітработа ў масах, глыбокае вывучэньне тэхнікі справы, работа не ў канцылярыі, а на вытворчасьці—вось у асноўным канкрэтныя шляхі перабудовы.

Пастанова СНК і ЦК адзначае, што праведзеная арганізацыя інстытутаў парторгаў, за апошнія гады паўгэна ўнесла паляпшэньне ў становішча працдысцыпліны, але яно зусім яшчэ невыстарчальнае.

«ДЛЯ ДАСЯГНЕНЬНЯ НАЛЕЖНЫХ РЭЗУЛЬТАТАЎ, гаворыцца ў пастанове, у СПРАВЕ ЎКАРАНЕНЬНЯ СЬВЯДОМАЙ ПРАЛЕТАРСКАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ НА ЧЫГУНАЧНЫМ ТРАНСПАРЦЕ НЕАБХОДНА ЗРАБІЦЬ НАСТУПНЫ КРОК, А ІМЕННА: УВЕСЬЦІ ВА ЎСЁЙ СЕТЦЫ ЧЫГУНАК СЫСТЭМУ ПАЛІТАДДЗЕЛАЎ».

Гэта гістарычная важнасьці пастанова вынесена пасьля таго, як практыка ўжо апраўдала арганізацыю палітаддзелаў пры МТС і саўгасах. Палітаддзелы там адыгрываюць важнейшую ролю «у справе ўмацаваньня новага ладу на вёсцы», робяцца цэнтрамі згуртаваньня перадавых элемэнтаў калгаснай вёскі, важнейшымі вагарамі партыі ў справе арганізацыйнага і палітычнага ўмацаваньня саўгасаў і калгасаў, ачысткі іх ад клясава-варожых элемэнтаў, узмацненьня арганізуючай ролі камуніста і камсамольца.

На чыгуначны транспарт, як і на рад іншых галін народнай гаспадаркі прапезла шмат кулацкіх, контр-рэвалюцыйных элемэнтаў. «Будучы выштурхнутымі з каляіны і раскідаўшыся па ўсім СССР, гэтыя былыя людзі распаўзьліся па нашых заводах і фабрыках, па нашых установах і гандлёвых арганізацыях, па прадпрыемствах чыгуначнага і воднага транспарту і галоўным чынам — па калгасах і саўгасах... Задача заключаецца ў тым, каб выштурхнуць гэтых былых людзей з нашых-жа ўласных прадпрыемстваў і ўстаноў і канчаткова іх абясшкодзіць» (СТАЛІН).

Разам з тым на чыгунках ёсьць шмат адданых рабочых, перадавых ударнікаў, якія самаахвярна змагаюцца за бальшавіцкія планы, за ўздым транспарту.

Палітаддзелы выкінуць клясавага ворага, згуртуюць лепшыя сілы перадавых ударнікаў вакол сябе, будуць сапраўднымі цэ

ПАРТЫИНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Чыстка партыі ўзьнімае творчую актыўнасьць рабочых мас

НЕ ЗАСПАКОЙВАЦЦА ДА КАНЧАТКОВАЙ ПЕРАМОГІ

ОЦІЦЕБСК. (Ад нашых карэспандэнтаў).

Ганебная пляма лягла на партыйную арганізацыю фабрыкі «СЬЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ». Прарыў, ахапіўшы фабрыку, пагрыбліўся ўсё больш і больш. Ад 16,7 проц. у першым квартале да 84,4 проц. за май пры вялізарнай колькасьці браку і пораробак — гэкі ганебны баланс фабрыкі за 5 месяцаў, рэзультат «работы» былога спар куністычнага кіраўніцтва аднаго з буйнейшых у СССР швейных прадпрыемстваў — фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі».

Абнаўленьне кіраўніцтва супала з падрыхтоўчай работай да чысткі партыі. Новае кіраўніцтва ў асобе дырэктара фабрыкі тав. КАБЛАКОВА і сакратара парткому тав. РОХКІНДА здолела падрыхтоўку да чысткі партыі пераварыць у бальшавіцкую барацьбу за ліквідацыю прарыву, за форсаваньне колькаснага і якаснага выпуску прадукцыі.

15 чэрвеня па фабрыцы ў сувязі з недыходзячай чыткай быў абвешчан дакладнік штурму прарыву. На гэты раз штурм свайй строгай дзелавітасьцю, ліквідным правядзеньнем раду сур'ёзных апэрацый рэзка адрозьніваецца ад папярэдніх «штурмаў», дзе дзелавая работа падмянялася парадным шумі-хай.

Камуністы ў авангардзе сацспаборніцтва

Кіраўніцтва фабрыкі зразумела, што прарыў магчыма ліквідаваць толькі шляхам укараненьня ў штодзённую работу цэхаў і вучасткаў вышэйшых сацыялістычных форм барацьбы за тэмпы і якасьць, і што гэту барацьбу павінны, бясспрэчна, узначаліць камуністы. Вось чаму пачатак сацспаборніцтва цэхавай папярэдзіла спаборніцтва цэхавых і зьменавых парт'ячэек, а спаборніцтва вучасткаў — спаборніцтва партыйных груп. У аснову разгорнутага спаборніцтва парт'ячэек і партгруп пакладзена індывідуальнае спаборніцтва камуніста з камуністам, камуніста з беспартыйным рабочым. На сёньня з працоўных па варштату 303 камуністаў — 231 чал. ужо ахоплены індывідуальным спаборніцтвам. У цэхах гладзільным, пашыўным штаноў (зьмена «б») і цэху паліто члены і кандыдаты партыі на 100 проц. ахоплены індывідуальным сацспаборніцтвам.

Прыклад бальшавіцкай паслужыў бліскучым пачаткам для разгортваньня сацспаборніцтва і ўдзерніцтва сярод беспартыйных рабочых. 800 перадавых рабочых абвесьцілі слабе ўдарнікамі штурму, узялі конкрэтныя абавязкі па выкананьні колькасных і якасных паказальнікаў прамфінпляну, заключылі паміж сабой сацдагаворы. Гэтыя 800 чалавек на чале з 2 сотнямі камуністаў і зьяўляюцца перадавым атрадам штурму прарыву. Большасьць з іх аб'яднана ў новаарганізаваныя гаспадарча-разрахунковыя брыгады, якіх на фабрыцы арганізавана 13: у гладзільным цэху — 2 брыгады, у закройным — 4, у пінджачным — 1, у цэху пашыўкі штаноў — 2, у цэху паліто — 2 і 2 брыгады ў тэхчастцы.

Штодзённа пасьля першых 2-х гадзін работы ў часе 10-цімінутнага перапынку на вучастках і брыгадах праводзіцца зьменна-сустрэчнае плянаваньне, у часе абедзенага перапынку — нарады, на якіх абгаворваюцца канкрэтныя пытаньні (барацьба за якасьць, за працоўную дысцыпліну, работа машын і г. д.). На штодзённых кароценькіх партсходах камуністы робяць справаздачу аб сваёй рабоце і аб становішчы вучастку, дзе яны працуюць.

Першыя баі за тэмпы і якасьць

У баёх за тэмпы і якасьць асабліва вызначаецца ДРУГАЯ ЎДАРНАЯ ГРУПА ПІНДЖАЧНАГА ЦЭХУ ЗЬМЕНЫ «А». Да штурму група выконвала сваю праграму на 98 проц., а за дакладнік штурму на 109,9, за што група атрымала пераходны сьцяг трыкутніка фабрыкі.

Гэтыя посьпехі ёсьць рэзультат умелай увязкі падрыхтоўкі да чысткі з конкрэтнымі задачамі па выкананьні прамфінпляну. Зьменна-сустрэчнае плянаваньне стала штодзённым мэтадам работы групы. Яна ўзяла на буксір раней адставаўшую 6 групу пінджачнага цэху і ў рэзультаце 6-я група таксама пачала выконваць сваю вытворчую праграму на 101 проц.

З другой групы найлепшай зьяўляецца брыгада МАЦУЛЕВІЧА. Выконваючы свае колькасныя паказальнікі на 103 проц., яна канчаткова ліквідавала ў сябе брак. Пассобныя ўдарнікі брыгады значна ўзьнялі сваю норму выпрацоўкі. Так, калі работніца СЬВІСТУНОВА да абвешчаньня дакладніка штурму выконвала сваю праграму на 81 проц., то зараз гэта пічка ёю даведзена да 102 проц. Тав. КАРЫЕЛЬ таксама давёў выкананьне сваёй праграмы ад 74 проц. да 101 проц. Брыгада вылучыла з свайго складу трох грамадзкіх інспэктараў па якасьці, якія свае часова сыгналізуюць аб прарыве па якасьці на тым ці іншым вучастку, не дапускаюць папсаваных прадукцыі рухацца далей па канвэеры.

ЛЁЗУНГ — ДА ЧЫСТКІ ПАРТЫІ ПРЫЙСЬЦІ З ПОЎНЫМ ВЫКАНАНЬНЕМ СВАЙГО ВЫТВОРЧАГА ЗАДАНЬНЯ — маладзёжная гаспадарча-разрахунковая брыгада 7 ІСТУЖКІ ЦЭХУ ПАШЫЎКІ ШТАНОЎ — ператорван у жыцьцё. Замест 350 адзінак па пляну брыгада штодзённа выпускае са свайго канвэеру 400 адзінак — рэзультат спаборніцтва з рабочымі першага вучастку гэтага-ж цэху, рэзультат штодзённага ўжываньня зьменна-сустрэчнага плянаваньня, разгортваньня індывідуальнага спаборніцтва. У брыгадзе канчаткова ліквідаваны прагулы і спазьненьні на работу.

Сярод перадавікоў штурму знаходзіцца і БРЫГАДА № 3 ЗАКРОЙНАГА ЦЭХУ. Пастанова ЦК аб чысткі партыі сустрэла з боку рабочых брыгады самы гарачы водгук. У часе падрыхтоўкі да чысткі больш узьняўся творчы энтузіязм рабочых, шырока разгарнулася хваля індывідуальнага спаборніцтва. Нажавік т. ДЗЯТКІН выклікаў на спаборніцтва нажавіка тав. ПАПКОВА, ІВАНОЎ заключыў дагавор з РУТЭНБЭРГАМ і г. д. і г. д. У выніку т. Папкоў давёў выкананьне сваёй праграмы ад 95 проц. да 115 проц., тав. Дзяткін — ад 120 да 130 проц. За два месяцы сваёй работы — час падрыхтоўкі да чысткі — брыгада з'эканоміла матар'ялу на 1,373 руб.

У ГЛАДЗІЛЬНЫМ ЦЭХУ арганізаваная ў часе падрыхтоўкі да чысткі партыі брыгада на вучастку партгрупы т. ЗІЛЬБЭРМАНА спаборнічае з брыгадай вучастку партгрупы т. РОСІНА. Адзін раз у тры дні брыгады зьбіраюцца сумесна і падагульваюць вынікі свайго спаборніцтва. Пакуль што пярэшнятка застаецца за брыгадай вучастку партгрупы Зільбэрмана. Замест 380 адзінак па пляну брыгада штодзённа выпускае 500-550 адзінак. Перагледжваньне амаль зусім пікавідавана.

І наопул трэба адзначыць, што на асобных вучастках гладзільнага цэху работа значна палепшылася. У цэху шырока разгарнулася індывідуальнае спаборніцтва паміж камуністамі і беспартыйнымі рабочымі. Вынікі спаборніцтва ў налічэньнасьці — вучастак па гладжаньню пінджакоў выконвае свой прамфінпляц на 135 проц., вучастак па гладжаньню штаноў — на 104 проц.

Асабліва трэба падкрэсьліць работу брыгад тахчасткі. Брыгада т. РУДАМІНЭРА ўзяла на сябе абавязак датэрмінова выпусьціць з рамонту 3 спэцыяльныя пацельныя машыны, адсутнасьць якіх цягне за сабой павялічэньне завалу прадукцыі. Брыгада т. КАГАНА ў сваю чаргу абавязваецца забясьпечыць гэтыя імпартныя машыны запчасткамі свайго вырабу.

Камуністычны суботнік

Як бальшавікі могуць біцца за гаспадарча-палітычныя задачы — паказаў арганізаваны ў адзнаку чысткі партыі камуністычны суботнік. У гэтым суботніку прымалі ўдзел 1.100 чал. Брыгада ў 240 чалавек накіравалася ў сваю прыгарадную гаспадарку і закончыла першую праполку. Дзякуючы гэтаму зараз у разгары другая праполка. Астатнія ўдзельнікі суботніку, разьбіўшыся на брыгады, праводзілі рад работ: уборку цэхаў і фабрычнага двара, чыстку машын і трансьмісій. Галоўная работа была накіравана на ліквідацыю скопленага завалу прадукцыі. У гэты дзень былі папраўлены, праверены і здены ў склад 1.860 пінджакоў і 3.400 пар штаноў. Да 2.000 пар штаноў былі прышыты гузікі.

Асабліва праявілі сябе на суботніку, як добрыя арганізатары, работніцы САЛАЎЁВА (член партыі), ЗЬВЯГІНА і ЛЕВІНТАН (беспартыйныя), прыёмшчыкі-камуністы МАЕЎ і АЎРУГ і беспартыйныя ГОЛУБЕЎ і ТАРАНТ. Па скан чэньні суботніку ўдзельнікамі яго быў прапрацован загад Наркампёгпраму аб якасьці прадукцыі.

Трэба падкрэсьліць яшчэ адзін карты пераймаьня прыклад — гэта ЎСТУПЛЕНЬНЕ РАБОЧЫХ ФАБРЫКІ Ў САЦСПАБОРНІЦТВА З КАЛГАСАМІ КЛІМАВІЦКАГА РАЁНУ. Фабрычныя арганізацыі побач з іншымі мерапрыемствамі накіроўваюць у калгасы Клімавіцкага раёну 15 папішых членаў сваёй партарганізацыі для ўзмацненьня арг-партмасавай работы ў калгасах. У сваю чаргу калгасы Клімавіцкага раёну будуць садзейнічаць фабрыцы ў правядзеньні дэцэнтралізаваных загатовак — гэта значыць,—у паляпшэньні рабочага гаспадарчага снабжэньня. Асноўнае ва ўзаемным шэфстве — гэта ўзаемная перадача вопыту работы па выкананьні гаспадарча-палітычных задач.

У часе чысткі дабіцца канчатковага пералому

Можна прывесьці яшчэ рад характэрных фактаў, якія ілюструюць барацьбу перадавікоў за ліквідацыю прарыву. Бясспрэчна, што ў рэзультаце ўсяго гэтага кідкавы выкананьня праграмы па фабрыцы ад 54,7 проц. у мае ўзьнялася да 85—89 проц. за апошнія дні.

АДНАК, БЫЛО-Б ЗУСІМ НЯПРАВІЛЬНА І ПАМЫЛКОВА, КАЛІ-Б НА АСНОВЕ ЎЗОРНАЙ РАБОТЫ АСОБНЫХ ВУЧАСТКАЎ, МЫ ЎЖО КАНСТАТАВАЛІ ПЕРАЛОМ ВА ЎСЁЙ РАБОЦЕ ФАБРЫКІ. Гэта толькі першыя эрухі. Прарыў на фабрыцы ўсё яшчэ вялікі. Асабліва дрэнна стаіць справа з якасьцю. Даволі ўказаць на тое, што у цэху пашыўкі штаноў усё яшчэ ёсьць вялікі запас штаноў—каля 60 тысяч пар, якія яшчэ патрабуюць шмат пераробак і скончэньня апэрацый. Брак і пераробкі займаюць амаль ва ўсіх цэхах яшчэ значнае месца. ПРЫКЛАДНАЯ РАБОТА ПЕРАДАВЫХ ВУЧАСТКАЎ ЯШЧЭ НЯ СТАЛА ЗДАБЫТКАМ УСІХ ЦЭХАЎ ФАБРЫКІ.

Вось чаму на адкрытым агульна-партыйным сходзе, прысьвечаным пачатку чысткі партарганізацыі фабрыкі, які адбыўся 28 чэрвеня, гэтыя задачы былі пастаўлены ў центр увагі. На гэтым сходзе ад імя рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу фабрыкі быў паслан ліст рабочым-тэкстыльшчыкам, якія забясьпечваюць фабрыку сырцом, з патрабаваньнем даць фабрыцы сырэц добрай якасьці. Другі ліст паслан рабочым Уралу — галоўным спажыўцом прадукцыі, якую выпускае фабрыка. У гэтым пісьце рабочыя «Сьцягу індустрыялізацыі» абяцаюць у часе чысткі і ў далейшым накіраваць усе свае сілы на паляпшэньне якасьці прадукцыі.

Тысячны партыйны і камсамольскі капектыў фабрыкі «Сьцяг Індустрыялізацыі» ў часе чысткі партарганізацыі, павінны яшчэ больш узьняць сваю авангардную ролю, узначаліць творчы ўздым і актыўнасьць пяцітысячнай армі рабочых, памножыць вопыт перадавых брыгад і партгруп, дабіцца сапраўднага пералому ў выкананьні прамфінпляну.

Сацыялістычны рахунак рабочых—працаўніком гістарычнага фронту

Чыстка ячэйкі Гістпарту працягваецца. Шостага ліпеня на сходзе па чысткі прысутнічае дэлегацыя рабочых фабрыкі «Камунарка». Яны прышлі, каб прад'явіць ячэйцы Гістпарту сацыялістычны рахунак.

Тав. Сталін паставіў перад намі задачу глыбокага вывучэньня гісторыі партыі,—гаворыць тав. Мязьвядзева. Гэта мае вялікае значэньне для парт'арганізацыі Беларусі і асабліва для нашай ячэйкі, дзе большасьць партыйцаў з 1-2 гадовым партстажам. У гэтым павінна дапамагчы нам ячэйка Гістпарту. Нам неабходны папулярныя брашуры па барацьбе з дробна-буржуазнымі партыямі, кнігі па гісторыі бальшавізму.

— Мы патрабуем ад вас часьцей бываць на нашай фабрыцы, чытаць лекцыі па гісторыі партыі, замацаваць сталага кіраўніка для гуртка па гісторыі партыі, праз нашу шматтыражку асьвятляць барацьбу нашай партыі з ухілам ад правільнай лініі партыі. Гэта наш вам рахунак у часе чысткі вашай партарганізацыі.

Ад імя партарганізацыі інстытуту вылілі «Камунарні» прыняў тав. Поташ.

— Сац. рахунак рабочых павінен адыграць вялікую ролю, ён павінен умацаваць сувязь нашага калектыву з рабочымі масамі. Партыя даручыла нам адказную справу: у нашай навуковай і практычнай рабоце кожны з нас павінен змагацца за чыстату марксыцка-ленінскай тэорыі і ўзброіваць ёю шырокія партыйныя масы. Для гэта га мы рыхтуем рад работ на гісторыі партыі, да 30-годзьдзя другога зьезду партыі, на выкрыцьцю Бунду, нац дэмаў і г. д. Ваш выклік на сацспаборніцтва мы прымаем.

Тав. Пугачоў, сакратар ячэйкі Гістпарту, прад'явіў сустрэчны рахунак рабочым «Камунарні»: змагацца за павышэньне якасных паказальнікаў пляну, весьці бязьлітасную барацьбу з бракаробамі.

У бліжэйшы час сацдагавор «Камунарні» з ячэйкай Гістпарту будзе аформлен.

— Змагацца за дзейснасьць, канкрэтнасьць гэтага дагавору ў штодзённай працы—наш абавязак,— заявіў старшыня праверкому т. Пэдэр.

На «Камунарцы» чыстка радоў партарганізацыі прайшла пад знакам вялікага творчага ўздыму. Гэта павінны зрабіць і гісторыкі. Рабочыя фабрыкі «Камунарні» зьявіліся застрэльшчыкамі ў прад'яўленьні сацыялістычнага рахунку нашым навуковым установам. Гэты прыклад павінны падхапіць рабочыя ўсіх фабрык і заводаў Беларусі. Прад'яўляючы свой сацыялістычны рахунак рабочым установам, рабочыя масы дапамогуць паляпшэньню работы ўсіх нашых навуковых арганізацый.

Г. Р-ва.

Выгнаць з калгасу „Сноп“ кулацкае ахвосьце

(Ліст калгасьнікаў)

Калгас «Сноп» Зборскага сельсавету (Асіпавіцкі раён) існуе больш трох год, але за готы час гаспадарка не ўзмацнілася. Група клясавых ворагаў Чыгілейчыкаў, пралезшая ў калгас, сваёй кулацкай дзейнасьцю імкнецца разваліць яго.

Калгас узначальвае старшыня Чыгілейчык Іван, які ў часы грамадзянскай вайны зьяўляўся злосным дэзэртырам, меў цесную сувязь з бандамі. Пры белапольскай акупацыі ён быў актыўным агентам акупантаў, выдаваў лепшых бедняко ў і серадняко ў вёскі, якія аддана змагаліся з белапольскімі бандамі (Барысік Міхась і інш.).

Чыгілейчык раней быў старшынёю сельсавету, ён выкарыстоўваў службовую пасаду для сваіх кулацкіх мэт. Па яго намаганьні прыняты ў калгас усе яго родзічы, якія па сацыяльным пахаджэньні і сваёй кулацкай дзейнасьці зьяўляюцца заўзятымі ворагамі калгаснага будаўніцтва.

Чыгілейчык Ігнат—за разлагацельскую работу выгнан з калгасу вёскі Зборск. Зараз ён «актывіст» калгасу «Сноп».

Чыгілейчык Лявон да ўступленьня ў калгас меў заможную гаспадарку. На працягу 12 год працаваў царкоўным старастам.

Чыгілейчык Аніс да Кастрычніка ўскай рэвалюцыі доўгі час вытрымліваў валасным судзьдзёй. Пасьля рэвалюцыі быў царкоўным старастам. Судовыя рэпрэсіі Чыгілейчыка над працоўнымі акалячае насельніцтва памятае яшчэ і зараз. Цяпер ён праводзіць яўна контр-рэвалюцыйную работу ў калгасе. На кватэру да яго часта зьбіраюцца папы, заможнікі і іншае атрэп'е старога, буржуазнага ладу. За чаркай гарэлкі кампанія кулачча абмяркоўвае як найлепш разбурыць калгас.

Чыгілейчыкі займаюць зараз усе кіруючыя пасады ў калгасе (члены праўленьня, брыгадзіры, заг. МТФ, вартаўнікі і інш.).

У самаснабжэньні і разбазарваньні калгасных прадуктаў ім у калгасе няма межаў. Па пастанове «праўленьня» калгасу Чыгілейчыкам Пятру і Філіпу невядома на якіх падставах выцана па аднаму даросламу быку з абагуленага стада калгаснай МТФ. Калі-ж зьвярталася да праўленьня бяднячка-калгасьніца Канонік Зося з просьбай дазволіць ёй узяць цялё для гадоўлі, дык атрымала адказ: «Ня можам, у нас недаўкамплектавана МТФ».

За час прабываньня загатовачыкам МТФ Чыгілейчыка Пятра, малако з фармы ўся гэта кулацкая зграя атрымлівала ў неабмежаванай колькасьці. Даглядчыцай цялят працавала яго матка, якая увесь час брала сабе палову малака, якое выдавалася для кармленьня цялят. У выніку зьвыш 10 цялят ад недаяданьня загінула.

У неабмежаванай колькасьці бралася Чыгілейчыкам Пятром калгаснае сена і салома, а калгасьнікі, якія на сходах выкрывалі злачынствы Чыгілейчыкаў, атрымлівалі ад «праўленьня» спагнаньні (вымовы, папярэджаньні і інш.).

Старшынёй калгасу Чыгілейчыкам Іванам зпноена і разбазарана звыш 74 цэнтн. калгаснай бульбы. Значная частка мёду ад калгаснай пасекі скарыстана ім самім і значная колькасьць прадана.

Гэтай групай кулакоў прысвоена шмат калгаснага інвэнтару і зброі.

Калгасную маемасьць ахоўвае Чыгілейчык Майсей, таму ня дзіва, што яна разбазарваецца направа і налева...

Беднякі і серадняк ў калгасе зацісьнуты, яны баяцца Чыгілейчыкаў. Усе акты, складзеныя на ўкрадзеную і разбазаравую маемасьць, Чыгілейчыкам Іванам носяцца ў кішэні.

Дзейнасьць абнаглелай кулацкай зграі прывяла да таго, што на працягу апошніх год у калгас ня прылілося ніводнай бядняцкай і серадняцкай гаспадаркі. «Пакуль будуць арудаваць Чыгілейчыкі ў калгасе, мы ў калгас ня пойдзем», — так заяўляе большасьць бедняко ў і серадняко ў аднаасобнікаў.

7 подпісаў калгасьнікаў.

АД РЭДАКЦЫІ: «Зьвязда» чакае ад Асіпавіцкага РК КП(б)Б тэрміновых мер па ачышчэньню калгасу «Сноп» ад клясава-варожых элемэнтаў.

Аб прынятых мерах паведаміце рэдакцыю.

Сын кулака на чале кіраўніцтва калгасу

(Ліст калгасьніка)

Калгасам «Чырвоны Сьцяг» Вадвянскага сельсавету (Шклоўшчына) кіруе сын кулака Шэпкін Герасім. Бацька яго да Кастрычніцкай рэвалюцыі меў 25 га зямлі. Трымаў 5-6 кароў, 3 коняй і ўвесь час карыстаўся наёмнай рабочай сілай. Гаспадарка самаго Шэпкіна Герасіма абкладвалася цьвёрдым заданьнем.

Шэпкін перашкаджае уступленьню ў калгас беднякам і сераднякам. Нядаўна, напрыклад была падана заява аб уступленьні бедняком Чыжанавым Уладзімірам, але яму адмовілі ў прыёме. На паседжаньні праўленьня, дзе разглядалася заява, «старшыня» Шэпкін заявіў: «Ня варта нам прымаць у калгас беднякоў; гаспадаркі іх мізэрныя і калгасу зусім мала карысьці ад іх».

Сакратар партыйнай ячэйкі Гольцаў і старшыня сельсавету Цітоў зрасьліся з кулакамі і дзейнічаюць за адно з Шэпкіным. Пры садзейнасьці Цітова і Гультаява ў калгас пралезьлі кулакі. У аддзяленьне «Другая пяцігодка» калгасу «Чырвоны Сьцяг» прынят былы дзяк, лішэнец—Лявонен ка Васіль, які да ўступленьня ў калгас меў 17 га зямлі і карыстаўся ўвесь час пастаяннай наёмнай рабочай сілай. Пры ўступленьні ў калгас ён усю маемасьць разбазарыў. Зараз Лявонен ка загадчык гаспадаркі ў калгасе, яго сын сакратар камсамольскай ячэйкі.

Знайшоў сабе прытулак у калгасе сын дзяка Галадноўскі Сяргей. Гаспадарка яго складалася з 40 га зямлі, 5 кароў, 5 коняй. Ён увесь час трымаў на 1-2 батракі. З 1930 году Галадноўскі—лішэнец, падлягаў высылцы за межы БССР, як кулак, але пад апякунствам старшыні сельсавету Цітова ён пралез у калгас і яму даручана вартаваць калгасную маёмасьць.

Пры дапамозе Цітова пазбаўлен высылкі і прыняты у калгас кулак Салодкін Адам. Да ўступленьня ў калгас ён меў 18 га зямлі, 2 кані, 3 каровы. У 1930 годзе абкладываўся індывідуальна.

Былы старшыня Вадвянскага сельсавету Цітоў працуе зараз у Шклоўскай райКК-РСІ. Калгасьнікамі нашага калгасу дасланы туды шмат допісаў аб засьмечанасьці калгасу, але і да сёньняшняга дня ніякіх мер ня прынята.

Х. К.

Ад рэдакцыі: Шклоўскаму РК КП(б)Б, трэба зацікавіцца кіруючым складам Вадвянскай партыйнай ячэйкі і сельсавету і ў бліжэйшыя дні ачысьціць калгас «Чырвоны сьцяг» ад кулакоў, прыцягнуць да суровай адказнасьці кулацкага агэнта Цітова.

пракурор „дапамагае“

(Ліст калгасьнікаў)

Наша брыгада ў колькасьці 16 чалавек з калгасу «Чырвоны Трудавік» (Уваравіцкі раён) у жніўні месяцы 1932 году доўгі час працавала на сенаўборцы ў Рэчыцкім Луггасе. За ўвесь час брыгадай зароблена 1469 руб лёў. Згодна догавору з калгасам, Луг гас павінен быў выплаціць грошы на шай брыгадзе адразу-ж пасьля скончэньня работы. Але з-за адсутнасьці грошы ў той час, на зароблену суму Луггас нам выпісаў чэк.

Хутка скончыцца год, між тым, грошы ад Луггасу мы не атрымалі яшчэ і да сёньняшняга дня. Роўна 21 раз на адлегласьці 30 кілёмэтраў мы хадзілі ў кантору Луггасу, але апрача абяцанак нічога канкрэтнага не дабіліся.

Зьвярталіся за дапамогай да пракурора Рэчыцкага раёну, які замест прыняцьця адпаведных мер адказаў нам: «бачыце, няма грошай таму і ня плацяць, прыдзецца пачакаць крыху».

9 подпісаў калгасьнікаў.

АД РЭДАКЦЫІ «Зьвязда» патрабуе ад Рэчыцкай РКК-РСІ тэрміновага расьсьледаваньня гэтай справы і прыцягненьня вінаватых да судовай адказнасьці.

Аб выніках паведамце рэдакцыю.

А. В--скі

У БАРАЦЬБЕ ЗА ПРАЛЕТАРСКІ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗМ*)

Першыя гады пралетарскай рэвалюцыі працякалі ў Беларусі ў надзвычай цяжкіх умовах. Імперыялісты Захаду ў шэрагі ваенных паходаў супроць рэспублікі Саветаў абрушыліся на Савецкую Беларусь. Пралетарыят і працоўныя Беларусі ў саюзе з працоўнымі ўсёй краіны Саветаў пад кіраўніцтвам партыі абаранялі незалежнасьць Савецкай Беларусі ў барацьбе супроць акупантаў нямецкіх, польскіх і розных банд.

Як-жа пранялі сябе ў гэтыя цяжкія гады «паборнікі нацыянальнага духу»? Яны тут паказалі сябе, як злёйшыя ворагі незалежнасьці працоўнага народу, пралетарскай дыктатуры.

Беларускія нацдэмы, гэты, якія не цалым год да гэтага крычалі на ўсіх перакрыжаваньнях пра нейкае аб'яднаньне славян, рабіка кінуліся зараз, подбаючы перад нямецкімі інтэрвэнтамі. Гэтыя яны паказалі, што сутнасьцю ўсіх гутарак аб «славянскім духу» і інш., як і ўсякага буржуазнага нацыяналізму, зьяўляюцца клясавыя інтарэсы буржуазіі. А паколькі ўлада ў Расіі была ў руках рабочых і сялян, дык яны, ідэолягі капіталістаў і паўсядзіцкаў, шукалі ратунку ў нямецка-імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі. Гэтыя 800 чалавек на чале з 2 сотнямі камуністаў і зьяўляюцца перадавым атрадам штурму прарыву. Большасьць з іх аб'яднана ў новаарганізаваныя гаспадарча-разрахунковыя брыгады, якіх на фабрыцы арганізавана 13: у гладзільным цэху — 2 брыгады, у закройным — 4, у пінджачным — 1, у цэху пашыўкі штаноў — 2, у цэху паліто — 2 і 2 брыгады ў тахчастцы.

Штодзённа пасьля першых 2-х гадзін работы ў часе 10-цімінутнага перапынку на вучастках і брыгадах праводзіцца зьменна-сустрэчнае плянаваньне, у часе абедзенага перапынку — нарады, на якіх абгаворваюцца канкрэтныя пытаньні (барацьба за якасьць, за працоўную дысцыпліну, работа машын і г. д.). На штодзённых кароценькіх партсходах камуністы робяць справаздачу аб сваёй рабоце і аб становішчы вучастку, дзе яны працуюць.

Першыя баі за тэмпы і якасьць

У баёх за тэмпы і якасьць асабліва вызначаецца ДРУГАЯ ЎДАРНАЯ ГРУПА ПІНДЖАЧНАГА ЦЭХУ ЗЬМЕНЫ «А». Да штурму група выконвала сваю праграму на 98 проц., а за дакладнік штурму на 109,9, за што група атрымала пераходны сьцяг трыкутніка фабрыкі.

Гэтыя посьпехі ёсьць рэзультат умелай увязкі падрыхтоўкі да чысткі з конкрэтнымі задачамі па выкананьні прамфінпляну. Зьменна-сустрэчнае плянаваньне стала штодзённым мэтадам работы групы. Яна ўзяла на буксір раней адставаўшую 6 групу пінджачнага цэху і ў рэзультаце 6-я група таксама пачала выконваць сваю вытворчую праграму на 101 проц.

З другой групы найлепшай зьяўляецца брыгада МАЦУЛЕВІЧА. Выконваючы свае колькасныя паказальнікі на 103 проц., яна канчаткова ліквідавала ў сябе брак. Пассобныя ўдарнікі брыгады значна ўзьнялі сваю норму выпрацоўкі. Так, калі работніца СЬВІСТУНОВА да абвешчаньня дакладніка штурму выконвала сваю праграму на 81 проц., то зараз гэта пічка ёю даведзена да 102 проц. Тав. КАРЫЕЛЬ таксама давёў выкананьне сваёй праграмы ад 74 проц. да 101 проц. Брыгада вылучыла з свайго складу трох грамадзкіх інспэктараў па якасьці, якія свае часова сыгналізуюць аб прарыве па якасьці на тым ці іншым вучастку, не дапускаюць папсаваных прадукцыі рухацца далей па канвэеры.

ЛЁЗУНГ — ДА ЧЫСТКІ ПАРТЫІ ПРЫЙСЬЦІ З ПОЎНЫМ ВЫКАНАНЬНЕМ СВАЙГО ВЫТВОРЧАГА ЗАДАНЬНЯ — маладзёжная гаспадарча-разрахунковая брыгада 7 ІСТУЖКІ ЦЭХУ ПАШЫЎКІ ШТАНОЎ — ператорван у жыцьцё. Замест 350 адзінак па пляну брыгада штодзённа выпускае са свайго канвэеру 400 адзінак — рэзультат спаборніцтва з рабочымі першага вучастку гэтага-ж цэху, рэзультат штодзённага ўжываньня зьменна-сустрэчнага плянаваньня, разгортваньня індывідуальнага спаборніцтва. У брыгадзе канчаткова ліквідаваны прагулы і спазьненьні на работу.

Сярод перадавікоў штурму знаходзіцца і БРЫГАДА № 3 ЗАКРОЙНАГА ЦЭХУ. Пастанова ЦК аб чысткі партыі сустрэла з боку рабочых брыгады самы гарачы водгук. У часе падрыхтоўкі да чысткі больш узьняўся творчы энтузіязм рабочых, шырока разгарнулася хваля індывідуальнага спаборніцтва. Нажавік т. ДЗЯТКІН выклікаў на спаборніцтва нажавіка тав. ПАПКОВА, ІВАНОЎ заключыў дагавор з РУТЭНБЭРГАМ і г. д. і г. д. У выніку т. Папкоў давёў выкананьне сваёй праграмы ад 95 проц. да 115 проц., тав. Дзяткін — ад 120 да 130 проц. За два месяцы сваёй работы — час падрыхтоўкі да чысткі — брыгада з'эканоміла матар'ялу на 1,373 руб.

У ГЛАДЗІЛЬНЫМ ЦЭХУ арганізаваная ў часе падрыхтоўкі да чысткі партыі брыгада на вучастку партгрупы т. ЗІЛЬБЭРМАНА спаборнічае з брыгадай вучастку партгрупы т. РОСІНА. Адзін раз у тры дні брыгады зьбіраюцца сумесна і падагульваюць вынікі свайго спаборніцтва. Пакуль што пярэшнятка застаецца за брыгадай вучастку партгрупы Зільбэрмана. Замест 380 адзінак па пляну брыгада штодзённа выпускае 500-550 адзінак. Перагледжваньне амаль зусім ліквідавана.

І наопул трэба адзначыць, што на асобных вучастках гладзільнага цэху работа значна палепшылася. У цэху шырока разгарнулася індывідуальнае спаборніцтва паміж камуністамі і беспартыйнымі рабочымі. Вынікі спаборніцтва ў налічэньнасьці — вучастак па гладжаньню пінджакоў выконвае свой прамфінпляц на 135 проц., вучастак па гладжаньню штаноў — на 104 проц.

Асабліва трэба падкрэсьліць работу брыгад тахчасткі. Брыгада т. РУДАМІНЭРА ўзяла на сябе абавязак датэрмінова выпусьціць з рамонту 3 спэцыяльныя пацельныя машыны, адсутнасьць якіх цягне за сабой павялічэньне завалу прадукцыі. Брыгада т. КАГАНА ў сваю чаргу абавязваецца забясьпечыць гэтыя імпартныя машыны запчасткамі свайго вырабу.

Камуністычны суботнік

Як бальшавікі могуць біцца за гаспадарча-палітычныя задачы — паказаў арганізаваны ў адзнаку чысткі партыі камуністычны суботнік. У гэтым суботніку прымалі ўдзел 1.100 чал. Брыгада ў 240 чалавек накіравалася ў сваю прыгарадную гаспадарку і закончыла першую праполку. Дзякуючы гэтаму зараз у разгары другая праполка. Астатнія ўдзельнікі суботніку, разьбіўшыся на брыгады, праводзілі рад работ: уборку цэхаў і фабрычнага двара, чыстку машын і трансьмісій. Галоўная работа была накіравана на ліквідацыю скопленага завалу прадукцыі. У гэты дзень былі папраўлены, праверены і здены ў склад 1.860 пінджакоў і 3.400 пар штаноў. Да 2.000 пар штаноў былі прышыты гузікі.

Асабліва праявілі сябе на суботніку, як добрыя арганізатары, работніцы САЛАЎЁВА (член партыі), ЗЬВЯГІНА і ЛЕВІНТАН (беспартыйныя), прыёмшчыкі-камуністы МАЕЎ і АЎРУГ і беспартыйныя ГОЛУБЕЎ і ТАРАНТ. Па скан чэньні суботніку ўдзельнікамі яго быў прапрацован загад Наркампёгпраму аб якасьці прадукцыі.

Трэба падкрэсьліць яшчэ адзін карты пераймаьня прыклад — гэта ЎСТУПЛЕНЬНЕ РАБОЧЫХ ФАБРЫКІ Ў САЦСПАБОРНІЦТВА З КАЛГАСАМІ КЛІМАВІЦКАГА РАЁНУ. Фабрычныя арганізацыі побач з іншымі мерапрыемствамі накіроўваюць у калгасы Клімавіцкага раёну 15 папішых членаў сваёй партарганізацыі для ўзмацненьня арг-партмасавай работы ў калгасах. У сваю чаргу калгасы Клімавіцкага раёну будуць садзейнічаць фабрыцы ў правядзеньні дэцэнтралізаваных загатовак — гэта значыць,—у паляпшэньні рабочага гаспадарчага снабжэньня. Асноўнае ва ўзаемным шэфстве — гэта ўзаемная перадача вопыту работы па выкананьні гаспадарча-палітычных задач.

У часе чысткі дабіцца канчатковага пералому

Можна прывесьці яшчэ рад характэрных фактаў, якія ілюструюць барацьбу перадавікоў за ліквідацыю прарыву. Бясспрэчна, што ў рэзультаце ўсяго гэтага кідкавы выкананьня праграмы па фабрыцы ад 54,7 проц. у мае ўзьнялася да 85—89 проц. за апошнія дні.

АДНАК, БЫЛО-Б ЗУСІМ НЯПРАВІЛЬНА І ПАМЫЛКОВА, КАЛІ-Б НА АСНОВЕ ЎЗОРНАЙ РАБОТЫ АСОБНЫХ ВУЧАСТКАЎ, МЫ ЎЖО КАНСТАТАВАЛІ ПЕРАЛОМ ВА ЎСЁЙ РАБОЦЕ ФАБРЫКІ. Гэта толькі першыя эрухі. Прарыў на фабрыцы ўсё яшчэ вялікі. Асабліва дрэнна стаіць справа з якасьцю. Даволі ўказаць на тое, што у цэху пашыўкі штаноў усё яшчэ ёсьць вялікі запас штаноў—каля 60 тысяч пар, якія яшчэ патрабуюць шмат пераробак і скончэньня апэрацый. Брак і пераробкі займаюць амаль ва ўсіх цэхах яшчэ значнае месца. ПРЫКЛАДНАЯ РАБОТА ПЕРАДАВЫХ ВУЧАСТКАЎ ЯШЧЭ НЯ СТАЛА ЗДАБЫТКАМ УСІХ ЦЭХАЎ ФАБРЫКІ.

Вось чаму на адкрытым агульна-партыйным сходзе, прысьвечаным пачатку чысткі партарганізацыі фабрыкі, які адбыўся 28 чэрвеня, гэтыя задачы былі пастаўлены ў центр увагі. На гэтым сходзе ад імя рабочых

Па-бальшавіцку выканаць дырэктыву партыі аб дзяржстрахаваньні

ЦК УсеКП(б) у сваёй пастанове аб ліквідацыі скажэньняў у страхавой рабоце даў бальшавіцкую праграму карэннай перабудовы дзяржаўнага страхаваньня на вёсцы. Выкананьне яе павінна ў найкарацейшы тэрмін зрабіць страхавую справу сапраўдным вагаром умацаваньня калгасаў і аховы грамадзкай упасьнасьці.

Рэалізацыя даных указаньняў увесла палепшаньне ў справу дзяржаўнага страхаваньня. У некаторых раёнах (Гомель, Клімавічы) страхавая інспэкцыя ўзмоцнена вытрымаными, добрымі работнікамі. Арганізаваны страхавыя камісіі, якія па-баявому прыступілі да работы, усебакова і сур'ёзна падыходзяць да ліквідацыі страт (Шклоў, Менск). Пастанова партыі і новыя правілы абкладнога страхаваньня растлумачаны шырокім масам калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў.

Аднак, у радзе раёнаў важнейшая дырэктыва партыі аб дзяржаўным страхаваньні яшчэ ня стала праграмай штодзённай барацьбы за ліквідацыю скажэньняў па страхавой рабоце і не ўзьнята на належную палітычную вышыню.

Новыя правілы па абкладным страхаваньні на вёсцы, зацьверджаныя Саветам Народных Камісараў СССР, не выкарыстоўваюцца ў барацьбе за павышэньне ўраджайнасьці, за паляпшэньне догляду жывёлы, за належную пастаноўку ўліку і аховы грамадзкай упасьнасьці.

Аб тым сьведчыць адсутнасьць належнай барацьбы за ўмацаваньне страхавога апарату. Укамплектаванасьць яго толькі 63 проц. штату. Такія раёны, як Лепельскі, Чырвона-Слабодзкі, Бярэзінскі, Парыцкі, Пятрыкоўскі, Чэрвеньскі, Гарадоцкі, Мсьціслаўскі, Прапойскі, і Хойніцкі, ня маюць ні аднаго страхавога работніка.

Вельмі часта наглядаецца нясур'ёзныя адносіны да арганізацыі страхавых камісій. Як вынік гэтага, у радзе раёнаў страхавыя камісіі або зусім яшчэ не арганізаваны (Заслаўе) або арганізаваны толькі ў апошні час, пасьля прыезду работнікаў з Менску (Копысь, Слуцак). Але і створаныя страхавыя камісіі не разумеюць усёй сур'ёзнасьці ўскладзеных на іх партыяй і ўрадам задач, імкнуцца ўхіліцца ад актыўнага ўдзелу ў ліквідацыі страт шляхам перадачы ўсёй работы страхавым агентам.

Жыльлёвыя будынкі застрахаваны толькі ў суме ад 12 да 71 руб., што прыводзіць да дыскрэдытацыі справы дзяржаўнага страхаваньня (Клічаўскі раён).

Для таго, каб дабіцца ліквідацыі ўсіх тэтых недахопаў і праверыць у найкарацейшы тэрмін страхавую работу на вёсцы, з першага ліпеня па 1 жніўня праводзіцца ўсесаюзны рэйд праверкі выкананьня пастаноў ЦК аб сельскім абкладным страхаваньні. Для кіраваньня рэйдам СНК БССР арганізаваў рэспубліканскую і раённыя камісіі. Задача гэтых камісій, пад кіраўніцтвам партарганізацый мабілізаваць камсамол, рабочых заводаў, якія шэфствуюць над фінгоргранамі, фінансавы актыў, прафсаюзы, вызваленыя з вёскай, на праверку практычнага ажыцьцяўленьня пастаноў аб дзяржстрахаваньні, забясьпечыць шырокае азнаямленьне з пастановамі партыі па гэтым пытаньні, з новымі правіламі абкладаньня калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў. Гэта работа павінна быць увязана з правоткай і ўборкай, з актыўнай барацьбой з усякімі відамі бестаспадарчасьці і шкодніцтва. Трэба шырока растлумачыць, што ў выпадках зьнішчэньня маемасьці з-за бестаспадарчасьці, драпежных адносін да каня або шадбайных адносін да іншай маемасьці страхавая ўзнагарода ня будзе выплачвацца. Гэтыя шкоднікі павінны прыцягвацца да адказнасьці.

Рэйд павінен стварыць спатаянны актыў вакол страхавой работы на вёсцы, узмацніць страхавы апарат удзельнікамі рэйду, палітычна вытрымаными таварышамі і забясьпечыць правільную пастаноўку страхавой работы на вёсцы.

Выкананьне задач, пастаўленых перад рэйдам, можа быць забясьпечана толькі пры тых умовах, калі партыйныя камітэты, раённыя камісіі, прафсаюзы і камсамольскія арганізацыі ўпачаткуюць гэту работу і дадуць ёй належны апэрацыйны разварот і палітычны размах.

ЛЯХАЎ.

Домна № 7 зав. імя Дзяржынскага (Данбас) заваявала на 1-м усесаюзным конкурсе домен сьцяг «Правды». НА ЗДЫМКУ: Домна № 7.

Аўладаем вышынямі навукі і тэхнікі

Таварышы рабочыя, работніцы, калгаснікі, інжынэрна-тэхнічныя і навуковыя працаўнікі, камсамольцы БССР

Рабочая кляса, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі на чале з тав. Сталіным, у першую пяцігодку заварышла пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі. Пабудавана рад буйных гігантаў сацыялістычнай індустрыі. Створана свае машына-будаўніцтва, створаны гіганты сацыялістычнай сельскай гаспадаркі, асвоены новыя віды вытворчасьці (сынт. каўчук, плот. маса, штучны шоўк і іншыя).

«У ПЭРЫЯД ПЕРШАЙ ПЯЦІГОДКІ МЫ ЗДОЛЕЛІ АРГАНІЗАВАЦЬ ЭНТУЗІЯЗМ, ПАФОС НОВАГА БУДАЎНІЦТВА І ДАБІЛІСЯ РАШАЮЧЫХ ПОСЬПЕХАЎ. ГЭТА ВЕЛЬМІ ДОБРА, АЛЕ ЗАРАЗ ГЭТА НЕБЫСТАРЧАЛЬНА, ЗАРАЗ ГЭТА ПАВІННЫ МЫ ДАПОЎНІЦЬ ЭНТУЗІЯЗМАМ, ПАФОСАМ АСВАЕНЬНЯ НОВЫХ ЗАВОДАЎ І НОВАЙ ТЭХНІКІ, СУР'ЁЗНЫМ УЗЫЯЦЬЦЕМ ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦІ ПРАЦЫ, СУР'ЁЗНЫМ СКАРАЧЭНЬНЕМ САБЕКОШТУ. У ГЭТЫМ ЗАРАЗ ГАЛОЎНАЕ» (СТАЛІН).

Дзесяткі тысяч пралетараў і калгаснікаў авалодваюць навукай і тэхнікай у школах, тэхнікумах, вышэйшых навучальных установах, тэхнічных гурткох на вытворчасьці, саўгасах, калгасах і МТС. Расьце камандны склад нашай сацыялістычнай гаспадаркі. Растуць рады новай рабочай вытворча-тэхнічнай інтэлігенцыі. Мы атрымліваем перамогу за перамогай на фронце тэхнічнай вучобы.

Але гэтыя дасягненьні не выстарчальны ў сувязі з задачамі, пастаўленымі другой пяцігодкай па завяршэньні сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі і авалоданьні тэхнікай новых фабрык, заводаў, саўгасаў, калгасаў і МТС.

Гэта патрабуе выключнага росту ўсіх відаў тэхнічнай грамадзкасьці: ад рабочых гурткоў на фабрыках і заводах, агразоатэхнічных гурткоў у МТС, саўгасаў і калгасаў да навукова-тэхнічных і навуковых таварыстваў і гурткоў самай высокай кваліфікацыі. Кожны працоўны павінен аўладаць тэхнікай для таго, каб ва ўсеўзбраеньні весьці барацьбу за выкананьне сваёй работы і ўсяго вялікага пляну сацыялістычнай перабудовы грамадзтва.

Рабочы, калгаснік, інжынэр, тэхнік, канструктар! Кожны з вас павінен на сваём вучастку вывучыць новую тэхніку, хутка асваіваць новае абсталяваньне і мэтады работы. Мы ствараем і павінны стварыць свае ўласныя і найлепшыя машыны, канчаткова вызваляючыся ад тэхніка-эканамічнай залежнасьці перадавых капіталістычных краін.

Адным з галоўных удзелнікаў у правядзеньні ўсіх гэтых задач зьяўляецца таварыства «ЗА АВАЛОДВАНЬНЕ ТЭХНІКАЙ». Гэтыя таварыствы да гэтага часу не атрымалі неабходнага разьвіцьця ў БССР і не сталі масавымі арганізацыямі з прычыны таго, што «З БОКУ АСОБНЫХ ПАРТЫЙНЫХ, ПРАФСАЮЗНЫХ І ГРАМАДЗКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ НАГЛЯДАЕЦЦА АПАРТУНІСТЫЧНАЯ НЕДААЦЭНКА ЎСЁЙ ПАЛІТЫЧНАЙ ВАЖНАСЬЦІ РАЗГОРТВАНЬНЯ ТЭХНІЧНАЙ ПРАПАГАНДЫ. НЯ СТВОРАНА АДПАВЕДНАЯ ГРАМАДЗКАЯ ДУМКА, ШЫРОКІЯ МАСЫ НЕВЫСТАРЧАЛЬНА ПРЫЦЯГНУТЫ ДА СПРАВЫ АСВАЕНЬНЯ ТЭХНІКІ. НАВУКОВА ІНЖЫНЭРНА-ТЭХНІЧНЫЯ ТАВАРЫСТВЫ (НІТО) І ТАВАРЫСТВЫ «ЗА АВАЛОДВАНЬНЕ ТЭХНІКАЙ» (ЗОТ) ДАГЭТУЛЬ НЯ ВЫШЛІ З АРГАНІЗАЦЫЙНАГА ПЭРЫЯДУ І НЕ ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА МАСАВЫМІ АРГАНІЗАЦЫЯМІ. У НАРКАМАТАХ ІСНУЕ АБЯЗЬЛІЧКА І АДСУТНІЧАЕ АПЭРАЦЫЙНАЕ КІРАЎНІЦТВА» (з пастановы сакратарыяту ЦК КП(б)Б аб мерапрыемствах па тэхпрапагандзе ад 20 чэрвеня 1933 г.).

На асобных прадпрыемствах БССР ёсьць некаторыя зрухі ў разьвіцьці тэхнічнай прапаганды (ЗАВОДЫ «КАМУНАР», «БАЛЬШАВІК», ШОЎКАВАЯ ФАБРЫКА (МАГІЛЕЎ). Аднак, мы павінны з усёй бальшавіцкай самакрытыкай прызнаць, што рух тэхнічнай грамадзкасьці БССР па масавому авалоданьню тэхнікай не адказвае задачам, пастаўленым партыяй і ўрадам і ўказаньням правадыра партыі тав. Сталіна.

Шырокія пласты рабочых, работніц і ўдарнікаў сацыялістычных палёў не ўцягнуты ў ячэйкі «ЗОТ». Мы не ведаем яшчэ рашучай барацьбы з дрэнным інструктажам, дрэннай арганізацыяй работы, адсутнасьцю на вытворчасьці дакладных указаньняў аб тым, як працаваць, як паменшыць страты, як уніклуць браку, як увесьці новыя мэтады работы.

Таварышы рабочыя, работніцы, ІТР — перадавыя ўдарнікі сацыялістычнай вытворчасьці! Адзначым пастанову сакратарыяту ЦК КП(б)Б арганізацыяй і разгортваньнем работы ячэек «ЗОТ», працягваньнем і ўглыбленьнем вывучэньня тэхнікі, разгортваньнем рабочых гурткоў, прыцягненьнем да кіраўніцтва імі лепшых ІТР. Зьвяжам усю нашу барацьбу за авалоданьне тэхнікай з барацьбой за выкананьне тэхпрафінпляну, за выкананьне пастаноў верасьнёўскага пленуму ЦК УсеКП(б) 1932 г., з барацьбой за «дробязі» і ажыцьцяўленьне вялікіх задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Ячэйкі «ЗОТ» на прадпрыемствах, у саўгасах, калгасах, МТС і навучальных установах павінны весьці работу па шырокім разгортваньні тэхнічных гурткоў, па асваеньні новай тэхнікі, павышэньні кваліфікацыі, вывучэньні пытаньняў усёй вытворчасьці, асобных праблем тэхнічнай рэканструкцыі і г. д.

Авалоданьнем тэхнікай адкажам на заклік партыі да дальнейшага росту вытворчасьці і прадукцыйнасьці працы, да паляпшэньня якасьці прадукцыі, да павялічэньня выпуску шырспажыву і павышэньня ўраджайнасьці.

Перадавікі-ўдарнікі сацыялістычнай прамысловасьці і сацыялістычных палёў! Уключайцеся ў рады таварыства «ЗОТ»! Разгорнем тэхнічную грамадзкасьць! Памятуйце, што барацьба за авалоданьне навукай і тэхнікай ёсьць важнейшая частка агульнай барацьбы рабочае клясы за канчаткову ліквідацыю капіталістычных элемэнтаў і клясаў наогул, за пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва!

«НАМ ЗАСТАЛОСЯ НЯ ШМАТ ВЫВУЧЫЦЬ ТЭХНІКУ, АЎЛАДАЦЬ НАВУКАЙ. І КАЛІ МЫ ЗРОБІМ ГЭТА — У НАС ПОЎДУЦЬ ТАКІЯ ТЭМПЫ, АБ ЯКІХ ЗАРАЗ НЯ СЬМЕЕМ І МАРЫЦЬ. І ГЭТА МЫ ЗРОБІМ, КАЛІ ЗАХОЧАМ ГЭТАГА ПА САПРАЎДНАМУ» (СТАЛІН).

ЦЭНТРАЛЬНЫ САВЕТ ПРАФСЯЮЗНАЛЬНЫХ САЮЗАЎ БЕЛАРУСІ.
АРГБЮРО БЕЛАРУСКАГА ЦЭНТРАЛЬНАГА САВЕТУ ТАВАРЫСТВАЎ «ЗОТ», («ЗА АВАЛОДВАНЬНЕ ТЭХНІКАЙ»).
ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ ЛКСМБ.

Падрыхтаваць усе вагары для правядзеньня ільназагатовак

БССР у гэтым годзе поўнасьцю скончыла сяўбу ільну да 14 чэрвеня—на 15 дзён раней мінулага году. Лён пасеян пераважна на канюшынішчы па зяблевым ворыве, на цаліне і бульбяніщах. Гэта — самыя лепшыя гасьбы для ільну.

Сяўба ў тэрмін, на лепшых глебах, высокая якасьць палявых работ стварацць усе ўмовы для паляпшэньня ўраджайнасьці і атрыманьня высокаякаснай прадукцыі.

Але гэтага мала. Выканана толькі адна частка задачы. Трэба па-баявому правесьці поліва, падрыхтаваць да своячасовай і добраякаснай уборкі і, на рэшце, у поўнай гатоўнасьці сустрэць заготоўкі.

Як вырашаюцца гэтыя задачы? Трэба адкрыта сказаць, што яны выконваюцца нездавальняюча.

Возьмем поліва. Да 1 ліпеня плян поліва выканан на 51,6 проц., па паўночна Ізоне — на 52,2 проц., па цэнтральнай—на 52,1 проц., па паўдзённай —на 49,2 проц. На першым месцы ідуць Сеньненскі, Полацкі, Шклоўскі і Лёзьнянскі раёны, якія выканалі ад 78 да 95 проц. пляну.

Адстаюць Асьвейскі, Сіроцінскі, Вушацкі, Бешанковіцкі, Крупскі, Веткаўскі і Магілёўскі раёны, якія прапалолі ад 14 да 28 проц.

Такая ганебная работа—вынік апарту шістычнай бязьдзейнасьці раённых арганізацый і, галоўным чынам, сыстэмы Загатлён.

Яшчэ горш стаіць справа з падрыхтоўкай да ўборкі і загатовак ільну.

Абсьледаваньне 89 рашаючых ільнаводчых раёнаў паказала, што канторы Загатлён і райза ня ведаюць, колькі ёсьць і колькі патрэбна мачыльных ям, сушыльна-мяльных пунктаў, ільнамялак, ільнатрапалак. Многія раённыя канторы Загатлён ня ведаюць, колькі складаў трэба падрыхтаваць да прыёмкі ільнаволакна і семя.

Рад кантор яшчэ не разьлічыліся са здатчыкамі ільну за прадукцыю мінулага году. Запазычанасьць кантор складае 54 тысячы руб. Бешанковіцкая кантора Загатлён мае запазычанасьць у 16 тысяч рублёў, Сіроцінская—8.500 руб., Мсьціслаўская — 6.800 руб. Такая работа толькі дапамагае кулацкай агітацыі і тармозіць загатоўкі.

Ня ўсюды прадведена ачыстка апарату Загатлён ад чужых, кулацкіх элемэнтаў. Рад раённых кантор дагэтуль ня вызначылі людзей на курсы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі спецыялістаў па прыёмцы прадукцыі.

Праверка падрыхтоўкі да загатовак паказала таксама, што многія райзагі, земельныя органы, раённыя савецкія і партыйныя арганізацыі (Бешанковічы, Дубровна, Бялынічы, Выхаў, Чырвонапольле) зноў пакінулі ільназагатоўкі на самацёк.

Толькі недаваленкай ільназагатовак можна тлумачыць такія факты, як адна цьцё складаў ад канторы Загатлён і перадач іх іншым арганізацыям у Гарадоцкім і Быхаўскім раёнах, як высялення Дубровенскай канторы з займаемага памяшканьня. Чым іншым можна тлумачыць такія факты, як вымены загатчыкаў кантор Загатлён у Слуцку і Ветцы па 3-5 разоў у год бяз санкцыі вышэйшых органаў.

Чым іншым можна тлумачыць тое, што раённыя арганізацыі ў Бешанковічах, Выхаве, Ветцы, Чырвонапольлі, Карме на працягу чатырох месяцаў ня можуць падабраць і прызначыць загатчыкаў кантор і ўкамплектаваць апарат Загатлён.

Каму, як не кулаку, дадамагае разбазраваньне хлеба, адпушчанага на кал трактарыцы і загатоўкі ільну ў Бялынічскім раёне—20 тон, у Магілёўскім — 30.

Мы ня можам далей цярпець такога становішча, каб загатоўкі ня выконваліся з году ў год, каб яны запаўзаліся да спрадзіны лета. Нават у гэтым годзе плян загатовак ільну выканан на 25 чэрвеня на 94,4 проц. па валакну і на 79 проц. па загатоўцы пянькі. Чаму Маскоўская, Ленінградзкая і Заходняя вобласьць ў гэтым годзе да тэрміну выканалі планы ільназагатовак. Таму, што там па-бальшавіцку змагаліся за плён на працяку ўсяго працэсу вытворчасьці.

Мы маем у гэтым годзе поўную магчымасьць пачаць загатоўкі ільну і пянькі са жніўня і скончыць іх да канца лістапада. На ажыцьцяўленьне гэтых задач ужо зараз трэба мабілізаваць усе сілы.

ЦК УсеКП(б) і СНК СССР у сваёй пастанове ад 16 чэрвеня падкрэсьлілі вялікае значэньне поліва, уборкі і перапрацоўкі ільну і канапель і патрабавалі ад партыйных і савецкіх арганізацый прыняцьця разу рашучых мер для выкананьня дзяржаўных заданьняў, якія маюць вялізарнае гаспадарчае значэньне. Гэта пастанова павінна быць даведзена да ведама кожнага калгасніка, кожнага працоўнага аднаасобніка. Бежыцкі раён, Маскоўская вобласьць, першым адгукнуўся на гэту пастанову і ўзяў на сябе абавязак правесьці перабленьне ільну на плошчы 18800 га ў 8 дзён, скончыць загатоўкі валакна да 7 лістапада, ільнасемя да 20 жніўня і здаць валакно па якасьці ня ніжэй 14 нумару. Бежыцкія калгаснікі выклікалі на сацпаборніцтва ўсе ільнаводныя раёны СССР.

Мы павінны прыняць бальшавіцкі выклік калгаснікаў Бежыцкага раёну і разгарнуць сацпаборніцтва на лепшае і хутчэйшае правядзеньне поліва, уборкі, апрацоўкі і здачы ільну дзяржаве.

Трэба дабіцца, каб загатоўчы апарат стаў актыўным арганізатарам і ўдзельнікам усіх працэсаў вытворчасьці ільну.

Ужо зараз трэба прымацаваць работнікаў загатоўчага апарату да сельсаветаў, калгасаў і вёсак для кіраўніцтва полівам, уборкай, апрацоўкай і загатоўкамі ільну і пянькі.

Трэба ўзяць на ўлік усе машыны па ўборцы і апрацоўцы ільну і прыняць ужо зараз меры да завозу неабходных машын. Неадкладна пачаць падрыхтоўку кадраў па аўладаньні тэхнікай складаных уборачных і апрацоўчых машын (ільнацерабілкі, «Гальштэйн», «Ёддаі» і інш.) з тым, каб максымальна іх скарыстаць, вядучы рашучую барацьбу з недаацэнкай машын. Ні ў якім разе не дапускаць абмалоту ільну на звычайных абожжавых малатарнях, якія псуюць валакно.

У бліжэйшы час закончыць рамонт старых і пабудову новых складаў для ільну і пянькі, прадэзынфэктаваць іх, ужо зараз вызначыць і падрыхтаваць сушыльна-мяльныя пункты.

Разьлічыць са здатчыкамі ільну на адданую прадукцыю ў 1932-33 г. і наадварот, спаланаць запазычанасьць у адносінах авансаў, выданых канфрактантам у 1932 г. Скончыць да 1 IX.33 году пабудову 29 ільназаводаў (Лёзьнянскі раён—тры ільназаводы, Гарадоцкі — 2, Лепельскі — 3, Мсьціслаўскі — 3 і г. д.), будаўніцтва якіх цягнецца яшчэ з 1931-32 году.

Наблізіць склады загатовак ільну да чыгуначных станцый і водных прыстаняй, каб менш траціць на перавозкі і больш хутка рабіць адгрузку. Неадкладна ўкамплектаваць апарат Загатлён лепшымі работнікамі, ачысьціўшы яго ад варожых элемэнтаў, паслаўшы на курсы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі лепшых ударнікаў з ліку рабочых ільназаводаў, калгаснікаў і г. д.

Правесьці шырокія нарады і канферэнцыі калгаснікаў і калгаснікаў, працоўных аднаасобнікаў і аднаасобніц па пытаньнях поліва, уборкі, і загатовак ільну. Правесьці нарады ўшчуваважаных на кантрактацыі, мабілізаваўшы іх увагу на штодзённы нагляд за выкананьнем кантрактацыйных дагавораў.

Трэба памятаць, што кулацкі, антысавецкія элемэнты імкнуцца сарваць нашу работу, сарваць уборку, апрацоўку і загатоўку.

Яны будуць імкнуцца патапіць лён, пакінуць яго на полі, як гэта мела месца ў Расонскім, Асьвейскім і Сіроцінскім раёнах у мінулым годзе.

Яны спрабуюць скарыстаць несьвядомасьць асобных адсталых калгаснікаў і аднаасобнікаў, каб здаваць дзяржаве недобраякасныя галункі ільну.

Кулацкія манэўры павінны быць адразу выкрыты і ліквідаваны.

Ф. Вайновіч.

Сартыроўка экспартнага лесу на прыстані Бакуновічы (Прапойск).

Аздаравіць кіраўніцтва друкарняй імя Сталіна

ВІНАВАТЫХ У ШКОДНІЦТВЕ СА СТАБІЛЬНЫМ ПАДРУЧНІКАМ—ДА АДКАЗНАСЬЦІ

Паводле дырэктыў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б стабільныя падручнікі для масавых школ павінны быць выпушчаны да 15 ліпеня. Зараз з усёй адказнасьцю можна заявіць, што гэта важнейшая дырэктыва партыі ў тэрмін ня будзе выканана. Больш таго, пры сучасных тэмпах работы друкарні імя Сталіна і пры тых безадказных адносінах, якія існуюць да гэтай справы з боку дырэктара яе тав. Брэнэйзэна, ёсьць пагроза, што школы не атрымаюць большасьці падручнікаў і да пачатку новага навучальнага году.

На апошнім пасяджэньні калегіі Наркамасьветы прадстаўнік Белпаліграфтрэсту т. Еленік урачыста заявіў, што друкарня імя Сталіна штодня выпускае 18.000 падручнікаў, а з 1-га ліпеня будзе выпускаць 35.000. Гэта заява —ніштo іншае, як ашукэнства, а карэньні яе хаваюцца ў мэтадах кіраўніцтва Паліграфтрэсту прадпрыемствамі і ў тым «очковтирательстве», якім займаецца адміністрацыя друкарні імя Сталіна, у прыватнасьці, дырэктар Брэнэйзэн.

Гэты адміністратар нават у часе яго персанальнай чысткі меў нахабнасьць заявіць, што пераплётны цэх за апошнія 2 тыдні штодзённа выпускае 17-18 тысяч падручнікаў. Мы з брыгадай Менскай гарКК-РСІ праверылі па фактурах самой друкарні паступленьне падручнікаў на базу ДВВ. За час з 15 да 28 чэрвеня ўключна на базу паступіла 124.535 падручнікаў і простая матэматыка гаворыць аб тым, што друкарня ў сярэднім выпускала 10.378 экз., а не 18.000, як упэўнівалі Еленік і Брэнэйзэн.

На 4-е ліпеня на базу ДВВ паступіла 10 беларускіх падручнікаў, з яўрэйскія, 1 польскі і адзін літоўскі. Але друкарня імя Сталіна з гэтай колькасьці падручнікаў амаль ніводнага не ала на базу поўным тыражом. Так, па ўсіх беларускіх падручніках друкарня недадала 162.000 кніжак, па яўрэйскіх —21.700 (пры тыражы ў 48 тыс.), польскіх замест 8 тыс. здала толькі 3.720, нават з літоўскім падручнікам, тыраж якога складае 1.500 экз., друкарня і тут умудрылася недадаць 120 кніжак.

Друкарня, як правіла, увесь час давала на базу сэктару кнігараспаўсюджаньня ДВВ у большасьці падручнікі з зусім вільготнымі пераплётамі. На базе, як правіла, іх адразу-ж пакавалі ў скрынні. Рабочыя базы, абураючыся, заяўлялі, што падручнікі ў скрынках папсуюцца, што гэта зьяўляецца яўным шкодніцтвам. Адміністрацыя друкарні і кіраўніцтва сэктару кнігараспаўсюджаньня ДВВ добра ведалі пра гэта, але першая ня спыняла здаваць на базу вільготныя падручнікі, а другое абуралася і адразу-ж іх пакавала для адпраўкі ў раёны. Загатчык базай ДВВ тав. Панцялееў добра ведаючы, у якім стане пакоюцца падручнікі і заяўляючы, што яны прыдуць на месца зусім папсаванымі, усё-ж выконваў суровыя «дырэктывы» сэктару кнігараспаўсюджаньня ДВВ. Толькі 3-та ліпеня Панцялееў надумаўся пайсьці на станцыю чыгункі і ўскрыць скрынкі, каб праверыць стан падручнікаў. У скрынках падручнікі аказаліся з запляснявелымі карапкамі пераплётаў, пераплёты многіх кніжак пасклеіваліся і калі разьняць два падручнікі, дык з аднаго з іх аддзіраецца папера—гэта ў горшым выпадку, а ў лепшым—малюнак з пераплёту адной кніжкі адрукоўваецца на другой (лемантар Сіўко). Для гэтага ня трэба было хадзіць нават на станцыю чыгункі, бо на базе каля 300 скрынак ляжаць запакаванымі больш за тыдзень і ўсё гэта можна было выявіць у сябе пад носам, што і выявілася 6 ліпеня. Калі база пачала ўскрываць свае запакаваныя скрынкі, дык можна было бачыць, як падручнікі пачалі гніць.

Замест таго, каб разам з друкарняй знайсьці шляхі для прасушкі падручнікаў, кіраўніцтва сэктару кнігараспаўсюджаньня ДВВ 4-та ліпеня зусім спыніла прыём кніжак і прывезеныя накіравала назад у друкарню. Зразуме ла, гэта галавадзіцтва, а ня выхад са становішча. Супроць будынку друкарні імя Сталіна ёсьць вялікія пустыя чыя склады Белгаржылсаюзу, у якіх можна нападзіць ня толькі прасушку падручнікаў, але і пасобныя працы пераплётнага цэху і нават тут-ма іх пакаваць для адпраўкі ў раёны. Усё гэта значна зьменшыла-б выдаткі на выданьне і прасоўваньне падручнікаў, значна зьменшыла-б патрэбы ў транспарце, ліквідавала-б тое шкодніцтва, якое зараз адбываецца з падручнікамі. Аказваецца, і адміністрацыя друкарні (Брэнэйзэн) і кіраўніцтва сэктару кнігараспаўсюджаньня ДВВ (Клейнэр) усё гэта добра ведалі, але абмяжоўваліся размовамі, людзі для ачысткі сумленьня нават пісалі паперкі, а ня станілі дзе належыць рашуча пытаньня, не дабіваліся таго, каб па-бальшавіцку ажыцьцявіць гэту каштоўную справу.

Урэшце, для прасушкі падручнікаў можна было-б скарыстаць памяшканьне аднэй са школ Менску, на прасушку падручнікаў можна было-б у крайнім выпадку ў парадку шэфства прыцягнуць піянэрскую арганізацыю. За гэту справу абавязан быў-бы ўзяцца саюз працасьветы. Але ні ЦП саюзу, ні гарком саюзу працасьветы ня ўдарылі пальцам аб палец, каб выраставаць ад псаваньня стабільныя падручнікі. Больш таго, ЦП працасьветы на апошнім пасяджэньні абмяркоўвала даклад сэктару кнігараспаўсюджаньня ДВВ аб прасоўваньні падручнікаў у раёны і ня выявіла фактуу псаваньня кніжак. Гэта здарылася таму, што ЦП саюзу не наладзіла сапраўднага апэрацыйнага кантролю за выданьнем падручніка, яно раней чым слухаць даклад не прыяло глыбокай папярэдняй праверкі, а заштампавала, тое, што дакладвалася прадстаўніком ДВВ. Не наладзіла сапраўднага кантролю за падручнікам і парт'ячэйка Наркамасьветы.

Мы вышэй ужо гаварылі, што на базах ДВВ скапілася каля 300 сярынак падручнікаў, якія ляжаць запакаванымі больш тыдню. Справа ў тым, што Саюзтранс забірае падручнікі вельмі малымі порцыямі, часам толькі па пяць скрынак у дзень. Падручнікі, з прычыны непаваротлівасьці адміністрацыі чыгункі, ідуць ад Менску да Баб руйску па 10-12 дзён, да Гомелю — 12 дзён, а ў Віцебск, Полацак і ў іншыя далёкія раёны—яшчэ больш. Калі падручнікі прыбываюць на месца прызначэньня, гэта ня значыць яшчэ, што яны адразу-ж распаўсюджваюцца і адпраўляюцца ў школы. На цэлым радзе раёнаў райвыканкомы адмаўляюцца адпускаць грошы на выкуп падручнікаў, адкладваючы гэта на канец кварталу. Напрыклад, загатчык Бабруйскага фінаддзелу тав. Аляксейчык про ста так і заявіў: «Зноў пачынаюцца падручнікі, зноў культура нас рэжа...» і сродкаў на выкуп апошніх не адпусьціў. Мы маем даныя аб тым, што падручнікі не выкупляюцца ў Гомелі, Жлобіне, Крычаве, Заслаўі, Быхаве, Хойніках, Дубровне, Касьцюковічах і ў радзе іншых раёнаў. У выніку падручнікі марнуюцца ў аддаленьнях ДВВ і, калі прыняць пад увагу мачы масьці кнігарань хаваць вялікую колькасьць кніжак, а таксама і якасьць падручнікаў (вільготныя пераплёты), дык стане зразумелым, што можа ўрэшце здарыцца з апошнімі.

«Зьвязда» ні адзін раз сыгналізавала аб агідных зьявішчах.

Досыць ужо размоў і гутарак. Становішча катастрофічнае.

Мы патрабуем неадкладнага зьняцьця апартуністычнага кіраўніцтва друкарні імя Сталіна, і кіраўніка вучэбсэктару ДВВ ГАЙДУКА, якія ня здольны і не жадаюць забясьпечыць рэалізацыю дырэктыў ЦК партыі. Мы патрабуем ад пракуратуры рэспублікі за яўнае шкодніцтва з падручнікамі вінаватых (Брэнэйзэн, Клейнэр, Гайдук, Панцялееў) неадкладна прыцягнуць да судовай адказнасьці. Спадзяемся, што ЦКК-НК РСІ неадкладна спыніць усю тую цеганіну, бюракратызм, непаваротлівасьць і безадказнасьць, якія існуюць яшчэ ў справе рэалізацыі дырэктыў ЦК партыі аб сваячасовым забясьпечэньні школ стабільнымі падручнікамі.

СУПРОЦЬ ІГНАРАВАНЬНЯ ЛЕСАЗАГАТОВАК І ВЫВАЗКІ

(Агляд рабселькораўскіх лістоў)

Другі квартал першага году другой пяцігодкі закончыўся. Аднак, ня ўсе галіны народнай гаспадаркі скончылі яго з посьпехам. Асабліва вялікі прарыў мы маем у выкананьні лесазагатоўчага пляну. Усяго за другі квартал Лесбел павінен быў загатовіць 1.110 тыс. кубамэтраў лесаматар'ялаў і дроў. Загатоўлена-ж толькі 923.300 кубамэтраў, або 80,3 проц. Зусім ганебныя лічбы дала лесавывазка. Замест 1.441 тыс. кубамэтраў вывезена толькі 973.720 кубамэтраў, або 60,8 проц. Такім чынам лесазагатоўчыя арганізацыі ў результаце дрэннай сваёй работы недадалі краіне дзесяткі тысяч кубамэтраў дзелавой драўніны і дроў.

У рэдакцыю «Зьвязда» штодзённа паступаюць дзесяткі лістоў рабселькораў, якія выкрываюць агідныя факты ігнараваньня лесазагатовак і вывазкі з боку многіх праўленьняў калгасаў, сельсаветаў, прарабскіх лясных вучастка ў, саміх леспрамгасаў і нават з боку асобных райкомаў партыі і райвыканкомаў.

Селькор Каласоўскі, напрыклад, піша, што

«Нічыпараўскі сельсавет Шклоўскага раёну пры наяўнасьці 338 косяка за дзьве дэкады чэрвеня вывез толькі 4 кбм. лесаматар'ялаў. Ні адзін кулак і заможнік, якім дадзены пьвёрдыя заданьні па лесавывазцы, у лес яшчэ зусім не выяжджаў».

Адзнай з асноўных прычын слабых тэмпаў лесавывазкі зьяўляецца значная засьмечанасьць апарату лесазагатоўчых арганізацый клясава-чужымі элемэнтамі. Гэты момант вельмі моцна падкрэсьліваецца ў кореспанденцыях рабселькораў. Так, рабкор «Свой» з Плешчаніцкага раёну піша, што

«на чале Плешчаніцкага леспрамгасу стаіць доўгі час былы ўласьнік буйнага млыну і іншых прадпрыемстваў на Чэрвеньшчыне—Хентаў, які ацэм не зацікаўлен у рабоце леспрамгасу. Ня гледзячы на тое, што лесавывазка па леспрамгасу зрываецца, Хентаў часта бярэ на 2-3 фурманкі з леспрамгасаўскага транспарту, нагружае іх дровамі і за 75 кілёметраў накіроўвае ў Менск для жонкі».

У адну руку з Хентавым працуе і сакратар парт'ячэйкі леспрамгасу Вараб'еў, ён-жа намесьнік Хентава па снабжэньні.

«Гэты Вараб'ёў—піша ў сваёй карэспанденцыі рабкор «Свой»—ажыгіў на сродкі леспрамгасу ў саўгасе Пятроліка 30 пудоў бульбы для сталоўкі. Але здарылася так, што яна замест сталоўкі трапіла на стол дырэктара і самаго Вараб'ёва».

І калі рабочыя транспарту тав. Зайдэнгард і інш. адважыліся выступіць на сходзе з крытыкай работы аддзелу снабжэньня, дык Вараб'ёў прапанаваў «заткнуць плявацельніцу», а пасьля пагражаў звальненьнем з работы.

Гэтыя абуючыя факты зажыму самакрытыкі з усёй сур'ёзнасьцю сьведчаць аб тым, што ў Плешчаніцкім леспрамгасе ня ўсё добра. Райком партыі і райвыканкам павінны зараз-жа прыняць меры па аздараўленьні апарату леспрамгасу.

Бягомльскі раён па лесавывазцы ў другім квартале вышаў адным з перадавых у БССР. Свой плян у колькасьці 10 тыс. кубамэтраў драўніны і 4 тыс. кубамэтраў дроў ён выканаў з перавышэньнем. Але ў лясных дачах Бягомльскага леспрамгасу ляжыць шмат загатоўленай драўніны. Лесьнік Ант. у сваім лісьце ў рэдакцыю піша:

«На прарабскіх вучастках (Бярэзінскім, Жамаўскім і Мсьцібскім) Бягомльскага леспрамгасу ляжыць шмат лесаматар'ялу, нават экспартнага, які загатоўлен тры гады назад. Частка яго з прычыны зацяжэньня ўжо страціла сваю каштоўнасьць».

У ФАШЫСЦКАЙ ГЕРМАНІІ

Баявы адпор наступленьню капіталу і фашызму

БЭРЛІН, 6. (УЛАСН. ІНФАРМ. «ЗЬВЯЗДЫ»). На Ганаверскім заводзе «ЭКСЭЛЬЗІЁР» дырэкцыя пастанавіла замяніць індывідуальную зьдзельшчыну калектыўнай, спадзяючыся гэтым шляхам правесьці зьніжэньне зарплаты.

Рабочыя пад кіраўніцтвам кампартыі і рэвалюцыйнай прафсаюзнай апазыцыі прыступілі да падрыхтоўкі барацьбы супроць намераў дырэкцыі.

Кампартыяй і рэвалюцыйнай прафапазыцыяй на заводзе пашыраліся лістоўкі, спатканыя з вялікай радасьцю рабочымі. У адным з цэхаў заводу выбухнула забастоўка, якая працягвалася 2 гадзіны. У ёй прынялі актыўны ўдзел сацыял-дэмакратычныя рабочыя.

Актыўнае выступленьне рабочых і ў асабліваасьці правядзеньне забастоўкі ў адным з цэхаў заводу, прымусіла дырэкцыю, пагражаючую закрыцьцём заводу, адмовіцца ад сваіх патрабаваньняў і захаваць на прадпрыемстве ранейшую сыстэму індывідуальнай зьдзельшчыны. Рабочым нават была выплачана розьніца ў зарплаце, недатрыманая імі ў сувязі з увядзеньнем новай формы зьдзельшчыны.

Нелегальная „Ротэ Фанэ" ахвотна чытаецца рабочымі Бэрліну

БЭРЛІН, 6. (УЛАСН. ІНФАРМ. «ЗЬВЯЗДЫ»). Распаўсюджаньне нелегальнай «РОТЭ ФАНЭ» бязупынна пашыраецца. 260 экз. апошняга нумару гэтай газэты былі распраданы менш чым у 10 мінут па кватэрах аднэй з вуліц у рабочым квартале Бэрліну.

У той час, як па кватэрах ішоў продаж газэт, дамы ахоўваліся дзяжурыўшымі на вуліцы пастамі рэвалюцыйных рабочых. Жыхары бралі газэты і выказвалі сваё задавальненьне з поваду яе выхаду.

Вышаў таксама нелегальны нумар «МАЛАДОЙ ГВАРДЫІ» — цэнтральнага органу камсамолу Германіі. Ён надрукован на 4 старонках і па зьместу ні ў чым ня ўступае свайму добраму зьнешняму афармленьню.

„Сталёвы шлём" поунасьцю падпарадкаваўся Гітлеру

Бэрлін 6. (Белта). Лідэр баварскай народнай партыі граф **Квадт** абвясьціў аб спыненьні ўсякай дзейнасьці партыі, а таксама спачуваючай студэнцкай арганізацыі, арганізацыі друку і г. д.

Сам Квадт падаў заяву аб прыняцьці ў нацыянал-сацыялістыцкую партыю і заклікаў усіх дэпутатаў баварскай народнай партыі ў рэйхстагу, а таксама ў ляндтагу пасьледваць яго прыкладу і адмовіцца ад мандатаў.

На ўсегерманскім зьезьдзе кіраўнікі нацыянал-сацыялістычных штурмавых атрадаў «Сталёвага шлему» канчаткова ўрэгулявалі пытаньне аб зьліцьці.

Гітлер распарадзіўся, што «Сталёвы шлем» падчыняецца вярхоўнаму кіраўніцтву штурмавых атрадаў і рэарганізуецца ў адпаведнасьці з меркаваньнямі гэтага кіраўніцтва.

***

Бэрлін 6 (Белта). Кіраўніцтва партыі цэнтру апублікавала пастанову аб самароспуску. Кіраўніцтва выказвае надзею, што маёмасьць партыі ня будзе канфіскавана і члены яе ня будуць арыштаваны.

З жыцьця беспрацоўных Варшавы

Голад і галеча сярод беспрацоўных Польшчы дасягнулі такіх разьмераў, што нават пэпэсаўскі «Роботнік» ня можа замаўчаць гэтай справы. У нумары ад 3 ліпеня мы знаходзім даволі вялікі артыкул аб жыцьці беспрацоўных Варшавы, якія выкінутыя з памяшканьняў за няўплату кватэрнай платы, тупяцца ў бараках на Аннаполі (прадмесьце Варшавы).

Вось, як апісвае гэты «гарадок» газэта:

«На паўночнай акраіне вялікай Варшавы, на гліністым грунце стаяць пабудаваныя магістратам 113 дрыўляных бараках, у якіх жыве напханых, як селядцоў у бочку, 11 тысяч бядомных, няшчасных беспрацоўных.

Уваходзім у сярэдзіну гэтага сваяасаблівага гарадку. Нас адразу ахоплівае нявыносны смурод. Тут няма ні толькі каналізацыі, але нават найзвычайнейшай прыбральні, бо тыя, якія ёсьць, знаходзяцца ў такім становішчы, што імі нельга карыстацца. Не хапае піцьцявой вады, але затое шырокія лужы стаяць паміж бараками ад учарайшага дажджу.

Аб лазьні і пральні, бясплатнай ці платнай і іншых неабходных установах, як аптэка, мэдпункт і г. д. няма чаго і гаварыць. Іх ніхто і ня думаў будаваць.

Жыхары гэтых бараках зусім ня маюць абутку і адзежы, бо нельга-ж назваць адзежай тыя лахманы, якімі яны прыкрываюць сваё цела. Іх ежу складаюць: гніляя бульба і некалькі лыжак дрэннага супу, які ім выдае магістрат.

У памяшканьнях брудна. У гэтым баноце і брудзе дзе-ні-дзе стаіць маленькая кухня, дзе-ні-дзе бярлога, на якой сьпяць чацьвёра-пяцёра дзяцей. Іх бацькі глядзяць тупым ад роспачы поглядам і маюць на вуснах толькі праклёны для сваіх «апякуноў».

Частка бяздомных жыве ў няскончаным доме, дзе няма ніякай столі, печак, падлогі, дзе дождж пыле проста за каўнер. І ў гэтым «памяшканьні» жыве 28 сем'яў».

Аднак, гэтым яшчэ далёка не канчаецца карцінка жыцьця беспрацоўных Варшавы. Гэта толькі 11 тысяч «шчасьлівых» змаглі знайсьці хоць нейкі дах.

Той-жа самы «Роботнік» ад 5 ліпеня піша:

«Лік людзей, нямаючых кватэры і начуючых на сходах, чардаках і пад мастамі складае 3.975 чалавек. Колькасьць іх бязупынна павялічваецца. Лёгка можна вылічыць, што да восені гэта лічба вырасьце да 12.000. А з упэўненасьцю можна сказаць, — гаворыць далей газэта, — што 99 проц. гэтых выкінутых з кватэр людзей, маюць законнае права на дапамогу, і незабесьпячэньне іх кватэрамі можа прывесьці да катастрофы».

Карцінка ясная: 11.000 БЕСПРАЦОЎНЫХ, ЯКІЯ ЖЫВУЦЬ У ГНІЛЫХ БАРАКАХ НА АННАПОЛІ І 12.000—БЕЗ УСЯЛЯКАГА ДАХУ НАД ГАЛАВОЮ». Тут непатрэбны ніякія камэнтары.

Н.

Агонія лёнданскай канфэрэнцыі

Лёндан 6 (Белта). Бюро сусьветнай эканамічнай канфэрэнцыі па прапанове **Макданальда** пастанавіла:

1. Прасіць кожную падкамісію, як найхутчэй прыняць сьпіс пытаньняў, якія яна лічыць карысным вывучаць.

2. Пасьля атрыманьня дакладаў падкамісій склікаецца бюро, каб выразьніць пытаньне аб далейшай рабоце канфэрэнцыі. Наступнае пасяджэньне бюро 10-га. Кампрамісное рашэньне аб працоўжаньні заняткаў канфэрэнцыі ў абмежаваным абёме разглядаецца, як часовае адтэрмінаваньне «сьмяротнага прыгавору».

***

Лёндан 6 (Белта). Делегацыя ПАЗШ на сусьветнай эканамічнай канфэрэнцыі апублікавала новую заяву, складзеную ў больш прыстойных тонах, але па сутнасьці нічым не адрозьніваючыхся ад папярэдніх заяў Рузвэльта. У заяве гаворыцца, што прэзыдэнт ня ўгледжвае цяпер ніякай карысьці ў часовай стабілізацыі ў адносінах валют паміж краінамі.

Байкот францускіх тавараў у Тунісе

ПАРЫЖ, 6. (Уласны інфарматар «Зьвязды»). У сувязі з апошнімі дэкрэтамі, накіраванымі супроць нацыянальнага руху, у Тунісе ўзмацнілася хваля пратэстаў. Як контр-меру супроць дэкрэтаў, тубільцы парашылі абвясьціць байкот францускіх тавараў. Гэты рух з кожным днём пашыраецца.

Пасьля байкоту табаку, мусульманскія жанчыны пастанавілі не адзявацца па-эўрапейску, а пасьць выключна нацыянальную вопратку, купленую толькі ў туніскіх фабрыкантаў і туніскіх гандляроў.

Гэта пастанова па сутнасьці зьяўляецца байкотам эўрапейскіх матэрый і ўсіх тых, хто імі гандлюе.

Барацьба беспрацоўных у ПАЗШ

Н'Ю-ЁРК, 6. (Уласны інфарматар «Зьвязды»). У **Калумбіі** (штат Огайо) абвясьцілі забастоўку 8.000 беспрацоўных, занятых на грамадзкіх работах. Яны патрабуюць выплаты зарплаты ў цьвёрдай валюце і прыбраўкі на сацстрах.

У **Правідэнсе (Род-Аллэнд)** 2.000 беспрацоўных патрабавалі скасаваньня зьніжэньня зарплаты беспрацоўным, занятым на грамадзкіх работах і анулываньня спагнаньняў, прымяняемых да забастоўшчыкаў.

У **Мэмфісе** 1.000 рабочых у результаце забастоўкі дабіліся скасаваньня зьніжэньня зарплаты.

Францускі ўрад запрасіў тав. Літвінава ў Парыж

ПАРЫЖ, 6. (Белта). Згодна афіцыяльнай прапановы францускага ўраду, тав. **Літвінаў** прыбыў з Лёндана ў **Парыж**. На вакзале яго прывітаў прад стаўнік міністэрства замежных спраў. Агэнцтва «Гавас» паведамляе, што тав. Літвінаў будзе госьцем францускага ўраду.

Старшыня Савету міністраў **Даляд'е** прыняў тав. **Літвінава** ў суправаджэньні тав. **Даўгалеўскага**.

Замежная хроніка

* Спэкуляцыйная ліхаманка ў ПАЗШ ня спыняецца. У сувязі з чаканьнем далейшага падзеньня даляра і інфляцыі, акцыі і цэны на тавары павышаюцца. Прамыслоўцы ў надзеі на павышэньне цэн накапляюць сыравіну. Гандляры робяць закупкі тавараў у разьмерах, якія шмат перавышаюць існуючы попыт.

* 28-га чэрвеня спушчаны на воду дзьве манчжурскія кананэркі, вадазьмяшчэньнем 55 тон кожная, з хуткасьцю 12 вузлоў. Кананэркі ўзброены некалькімі гарматамі, пражэктарамі і маюць радыё-ўстаноўку. Колькасьць каманды кожнай кананэркі — 20 чал.

* Эстонскі парлямэнт прыняў закон аб адмене залатога стандарту. Курс эстонскай кроны будзе зьніжан на 35 проц. Урадавыя колы чакаюць ад гэтага мерапрыемства паляпшэньня канкурэнтнай здольнасьці эстонскіх тавараў на заграніччных рынках.

ПАПРАЎКА

У тэлеграме «Гутарка тав. Літвінава з карэспандэнтам «Н'юс Кронікль», зьмешчанай у нумары ад 6 ліпеня па віне друкарні зроблена памылка.

Чацьвёрты абзац належыць чытаць: «Далей тав. Літвінаў заявіў, што ён задаволен АДНАЎЛЕНЬНЕМ перагавораў». (Надрукавана было «адмаўленьнем»).

Кандыдаты на прэміяваньне па ўсебеларускім спаборніцтве за лепшае правядзеньне веснавой сяўбы

Ніжэй друкуецца сьпіс кандыдатаў—перадавых ударнікаў: рабочых саўгасаў, брыгадзіраў калгасаў, калгаснікаў і лепшых перадавых працоўных аднаасобнікаў.

1. Крывіцкі Юлі Вікенцевіч — старшы конюх саўгасу «Горкі Абчаг», менскага Малпрамтрэсту.
2. Кідзін Пётра — рабочы саўгасу «Камсамолец», менскага Сьвіноводтрэсту.
3. Дарожка Уладзімер Алесяў — рабочы саўгасу «Горкі-Абчаг», менскага Сьвіноводтрэсту.
4. Карабальская Марыя — работніца саўгасу Уваравічы, гомельскага Малпрамтрэсту.
5. Рудзіцкі Мікола Янкаў — рабочы саўгасу Цікінічы, Гомельскага Малпрамтрэсту.
6. Сіман Янка — брыгадзір саўгасу «Вялікія Навасёлкі», менскага Малпрамтрэсту.
7. Отрынгель Рыгор, брыгадзір палявой брыгады саўгасу Отрэлічава, гомельскага Малпрамтрэсту.
8. Кірыльчык Мікола — рабочы саўгасу Весялова, менскага Малпрамтрэсту
9. Кавалёў Ігнат — рабочы саўгасу Уваравічы, гомельскага Малпрамтрэсту.
10. Навіцкі Зьмітрок—рабочы кавальсаўгасу Стрэлічава, гомельскага Малпрамтрэсту.
11. Жук Пілін — загадчык трактарнай майстэрні камбінату імя 10-годзьдзя БССР, Любаньскага раёну.
12. Дубко Сьцяпан — камсамолец трактарыст камбінату імя 10-годзьдзя БССР, Любаньскага раёну.
13. Губкоў Ахрэм Аўсеяў — рабочы саўгасу Ялава, Чавускага раёну.
14. Казлова Галя—ударніца саўгасу імя Лаге, Гомельскага раёну.
15. Кавалёў Пётра Федаровіч — рабочы саўгасу Ачоса-Рудня, Веткаўскага раёну.
16. Прылуцкі Алесь — рабочы саўгасу вучастку «Каменая горка», імя Карла Лібкнэхта, Менскага раёну.
17. Рабцаў Аўдакім Міхайлавіч — брыгадзір камуны «Серп і молат», Анхінецкага сельсавету, Чавускага раёну.
18. Белько Мікола — брыгадзір калгасу Зажэвіцкага сельсавету Старобінскага раёну.
19. Кудзелька Сьцяпан — брыгадзір калгасу «Гігант» Грэскага сельсавету Слуцкага раёну.
20. Качура Паўла — брыгадзір калгасу «КІМ» Чырвонка-Слабодзкага раёну.

(Працяг у наступным нумары).

12 ліпеня гарадзкая палітмасоўка

* 11 ліпеня ў летнім тэатры «Прафінтэрн» адбудзецца ЎРАЧЫСТЫ ПЛЕНУМ МЕНГАРСАВЕТУ з удзелам партыйных, прафэсыянальных арганізацый і прадстаўнікоў Чырвонай арміі, прысьвечаны XIII-й гадавіне вызваленьня БССР.

* 12 ліпеня ў гарадзкім садзе «Прафінтэрн» арганізуецца ВЯЛІКАЯ ПАЛІТМАСОЎКА працоўных Менску, у якой прымуць удзел дэлегаты 2-га Ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў і вайсковых часьцей.

Апрача мітынгу, у часе палітмасоўкі будуць наладжаны фізкультурныя спаборніцтвы, кіно, канцэрт, масавыя танцы і гульні.

* Фабрыкі і заводы Менску арганізуюць СУСТРЭЧЫ РАБОЧЫХ З ДЭЛЕГАТАМІ 2-ГА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ. На гэтых сустрэчах калгаснікі будуць азнаёмлены з работай прадпрыемстваў і ў сваю чаргу падзеляцца з рабочымі вопытам барацьбы за пасьпяховае завяршэньне сяўбы.

* Аўтадораўскія арганізацыі БССР увязваюць сьвяткаваньне гадавіны вызваленьня БССР ад белапалякаў з барацьбой за пасьпяховае правядзеньне дарожных работ, рамонту пад'язных шляхоў, з узмацненьнем работы ячэек аўтадору пры МТС, МТМ, саўгасах і калгасах.

12 ліпеня ў МЕНСКУ, ВІЦЕБСКУ, ПОЛАЦКУ, БАБРУЙСКУ, ГОМЕЛІ, БАРЫСАВЕ і інш. гарадох адбудуцца АЎТАДОРАЎСКІЯ СУБОТНІКІ ПА ДАПАМОЗЕ ДАРОЖНАМУ БУДАЎНІЦТВУ.

Прэміраваньне Старобінскага раёну за пасьпяховае завяршэньне рэалізацыі пазыкі 2-гой пяцігодкі

Пастанова НКФ БССР, Цэнтральнай камісіі садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчадсправе пры прэзыдыуме ЦВК і ЦСПСБ

Адзначаючы вялізарныя посьпехі, якіх у выніку шырокай масавай работы дабіліся арганізацыі, актыў і ўсе працоўныя Старобінскага раёну, закон чыўшы першымі ў БССР рэалізацыю пазыкі 2-й пяцігодкі па ўсіх сэктарох, выканаўшы агульны плян рэалізацыі пазыкі сярод рабочых і служачых на 134 проц., сярод іншага гарадзкога на сельніцтва на 170 проц., сярод калгаснікаў на 122,6 проц. і сярод аднаасобнікаў на 100,1 проц., Народны Камісарыят Фінансаў БССР, Цэнтральная Камісія Садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчадсправе пры Прэзыдыуме ЦВК БССР і Цэнтральны Савет Прафэсыянальных Саюзаў Беларусі пастанаўляюць:

1. Перавесьці ў распараджэньне Старобінскага райкамсоду, райфа і райпрафсавету 2.000 рублёў для прэміраваньня лепшых ударнікаў па рэалізацыі пазыкі.

2. Прэміяваць пэрсанальна сакратара Старобінскага РК КП(б)Б тав. ВАРОНЧАНКА, старшыню РВК тав. ГРЫШЧАНКА, старшыню РКК-РСІ тав. КАЛІНІНА, старшыню райпрафсавету тав. ТРЫГУБАВА і сакратара РК ЛКСМ тав. ГРАБАРА—па 200 рубл. кожнага.

Старшыню Раймясцкому саюзу фінбанкаўскіх работнікаў тав. ЧЭРНЯКА, загадчыка райфа тав. ШКРАБА, загадчыка райашчадкасы тав. ХІНІЧА і ўпаўнаважанага ЦСПСБ па рэалізацыі пазыкі 2-й пяцігодкі па Старобінскім раёне тав. ГЕЛЕРА — па 150 р. кожнага.

3. Заклікаць актыў і ўсіх працоўных Старобінскага раёну на далейшую актыўную барацьбу за лепшае абслугоўваньне пазыкатрымальнікаў, за пасьпяховае выкананьне фінансавых і іншых гаспадарча-палітычных мерапрыемстваў партыі і ўраду.

Народны Камісар Фінансаў БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

Старшыня Камсоду пры Прэзыдыуме ЦВК БССР М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

Старшыня ЦСПСБ КАВАЛЬЧУК.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 9 ліпеня 1933 г. а 10 гадз. раніцы адбудзецца пасяджэньне ПК ЦКК КП(б)Б на разгляду партпрацы наступных т. т.:

Бяспалава, Ганчучнікі, Альшэўскага (Быхаў), Шабкавенкі, Кагана (т. з. «Шлях Сацыялізму»), Шафранава, Фрыдмана, Варэнштэйна (Менпрамсаюз), Медзялянава П. Я., Макарава І. І., Валабрынскага, Гімельфарба (Камвуз), Гаркавенка (Асінавічы), Пташкова І. А., Чыгіра В. Р., Гарэліка М. Д., Шышкаранкі П. А., Індулёва (Мазыр), Нароенку (Лепель), Тумаровіча.

Яўка памянёных т. т. абавязкова. Праезд не аплачваецца. Да дня разгляду справы т. т. названы прадставіць ПК характарыстыкі ячэек аб сваёй апошняй рабоце.

Член ПК ЦКК КП(б)Б СЬЦЯПНЯК.

8 ліпеня г. г. а 6 гадз. увечары ў памяшканьні клюбу мэталістаў (Універсытэцкая, 12) склікаецца рэспубліканскі і гарадзкі сход прафактыву. Парадак дня: Вынікі III пленуму ЎсеЦСПС і аб зьліцьці органаў Наркампрацы і Сацстраху з прафсаюзамі (дакл. тав. Марчанка).

Уваход па прапускох ЦОПСВ, ЦП саюзаў і ГПС.

Сакратар ЦСПС Беларусі ЛІСКОВІЧ.

Выклікаюцца на 8 ліпеня а 1 гадз. дня ў культпроп ЦК КП(б)Б (пак. 106) загадчыкі сэктарамі кадраў наступных наркаматаў: Наркамасьветы—тав. Бялугла, НКЗ — тав. Пракопчык, Наркамлёпрам — тав. Сьмірноў, НКСаўтасаў тав. Новікаў, НКШляхпраму—тав. Жук, НКЗдраву — тав. Пячонка, Наркамфіну — тав. Прохараў, Наркамлесу, НКНС, Наркамснабу, Ленінградзкі парт. ваўч. гарадку — тав. Ларычкаў.

Культпроп ЦК КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Пра парадак здачы у арэнду і аплаты будынкаў, памяшканьняў і пляцоў, якія арандуюцца для гандлёва-прамысловых і складачных мэт

ПАСТАНОВА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. Органы камунальнай гаспадаркі, дзяржаўныя ўстановы і прадпрыемствы, кааперацыйныя і іншыя арганізацыі аграмаджанага сэктару абавязаны здаваць будынкі, памяшканьні і пляцы для гандлёва-прамысловых і складачных мэт, а таксама будынкі і памяшканьні на базарах і пляцох, якія знаходзяцца ў іх веданьні,—установам, прадпрыемствам і арганізацыям аграмаджанага сэктару толькі паводле гэтай пастановы.

Гэта пастанова не пашыраецца на гандлёва-прамысловыя і складачныя памяшканьні, якія знаходзяцца ў будынках адноўленых, пабудаваных або дабудаваных на падставе арт. арт. 71-86-б грамадзянскага кодэксу БССР (раздзел: права забудоўлі).

2. Устанавіць наступныя стаўкі арэндных платы за гандлёва-прамысловыя і складачныя памяшканьні за 1 кв. мэтр у месяц.

I. ЗА ГАНДЛЁВЫЯ ПАМЯШКАНЬНІ

Назва пунктаў	Тып памяшканьняў: Каменныя: Без абсталяв. (вада, прав. канал.)	Каменныя: З абсталяв. (вада, прав. канал.)	Мяшаныя: Без абсталяв.	Мяшаныя: З абсталяв.	Драўляныя: Без абсталяв.	Драўляныя: З абсталяв.	Поўпадвальн.: Без абсталяв.	Поўпадвальн.: З абсталяв.	Ліцёк у %
1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
Менск, Віцебск, Гомель	4-50	5-40	4-00	4-80	3-60	4-30	3-50	4-00	10-00
Бабруйск, Магілеў, Ворша, Слуцак, Полацак, Маазыр, Барысаў, Рэчыца	3-70	4-40	3-20	3-80	2-90	3-50	2-70	3-25	8-00
Астатнія гарады	2-85	3-40	2-60	3-10	2-40	2-65	2-20	2-60	5-00
Астатнія пункты	2-25	—	2-00	—	1-80	—	1-70	—	3-00

Камэрцыйныя сталоўкі, рэстараны і буфэты-закусачныя прыраўноўваюцца да гандлёвых памяшканьняў і аплачваюцца па стаўках, устаноўленых для гандлёвых памяшканьняў. Сталоўкі, рэстараны і буфэты закрытага тыпу аплачваюцца па стаўках гандлёвых памяшканьняў са скідкай у разьмеры 50 проц.

II. ЗА СКЛАДАЧНЫЯ ПАМЯШКАНЬНІ

Назва пунктаў	Тып памяшканьняў: Каменныя	Рубленыя	Дашчатыя	Падвальныя
Менск, Віцебск, Гомель	2-50	2-00	1-50	1-80
Магілеў, Ворша, Полацак, Мазыр, Барысаў, Рэчыца, Слуцак, Бабруйск	2-00	1-70	1-20	1-45
Астатнія гарады	1-60	1-35	1-00	1-25
Астатнія пункты	1-25	1-00	0-75	0-90

III. ЗА ПРАМЫСЛОВЫЯ ПАМЯШКАНЬНІ

Назва пунктаў	Тып памяшканьняў: Каменныя: Без абсталяв.	Каменныя: З абсталяв.	Мяшаныя: Без абсталяв.	Мяшаныя: З абсталяв.	Драўляныя: Без абсталяв.	Драўляныя: З абсталяв.	Поўпадвальныя: Без абсталяв.	Поўпадвальныя: З абсталяв.
Менск, Віцебск, Гомель	3-80	4-60	3-40	4-10	3-05	3-65	3-00	3-40
Бабруйск, Магілеў, Ворша, Полацак, Мазыр, Барысаў, Рэчыца, Слуцак	3-15	3-75	2-70	3-20	2-45	3-00	2-30	2-75
Астатнія гарады	2-40	2-90	2-20	2-60	2-00	2-25	1-90	2-20
Астатнія пункты	1-90	—	1-70	—	1-50	—	1-50	—

Да гэтых асноўных ставак могуць ужывацца скідкі і накідкі ў залежнасьці ад характару гандлю, становішча па мяшканьня, абсталяваньня і месца знаходжаньня яго.

Аднак, гэтыя скідкі ня могуць быць больш 15 проц., а накідкі больш 20 проц. асноўнай стаўкі.

За памяшканьні, якія прыгодны для хаваньня плодагародніны і арандуюцца Саюзплодагароднінай, спажывецкай і сельгаскаапэрацыяй, а таксама сыстэмай Саюзнаркарчу, арэндная плата спаганяецца паводле ставак, вызначаных пастановамі СНК СССР за 1 верасьня 1930 г. (З. З. СССР за 1930 г. № 45, арт. 478) і за 25 студзеня 1932 г. (З.З. СССР за 1932 г. № [illegible] арт. 76).

Ларкі, крамы, магазыны, арандуемыя калгасамі для калгаснага гандлю, аплачваюцца ў разьмеры 50 проц. устаноўленых ставак. Стаўкі арэндных платы за памяшканьні, будынкі, пляцы, якія здаюцца прамысловым, каапэрацыйным арцелям (таварыствам), устанаўляюцца са скідкай у разьмеры ня менш 20 проц. ставак, устаноўленых паводле гэтай пастановы з тым, аднак, каб да 1-га лістапада 1933 г. гэтыя стаўкі ня былі вышэй існуючых ставак.

3. Звыш арэндных платы на арандатараў гандлёва-прамысловых і складачных памяшканьняў могуць быць ускладзены толькі наступныя выдаткі:

а) па бягучым рамонце, ачыстцы, уборцы і асьвятленьні памяшканьняў, аплаце камунальных паслуг і цэнтральнага ацяпленьня;

б) па ўдзелу прапарцыянальна разьмеру сваёй плошчы ў агульных для ўсяго домаўладаньня эксплёатацыйных выдатках, а імянна: па страхоўцы будынкаў, аплаце падаткаў і збораў, па асьвятленьні і ачыстцы месц агульнага карыстаньня, па ўтрыманьні домакіраўніцтва, па знадворным бягучым рамонце, цэнтральнага ацяпленьня, водаправоду і каналізацыі, месц агульнага карыстаньня, тратуараў і брукаў, якія прылягаюць да арандуемага домаўладаньня.

Разьмер удзелу арандатара ў агульных выдатках па домаўладаньні (п. п. «а» і «б» арт. 3) прадугледжваецца арэндным дагаворам, заключаным паміж адтэтыкам і арандатарам памяшканьня.

Капітальны рамонт гандлёва-прамысловых і складачных памяшканьняў павінен рабіцца ўласьнікам домаўладаньня.

4. Перадаваць арандуемыя будынкі і памяшканьні, або часткі іх у субарэнду маюць права толькі тыя арганізацыі і ўстановы, якія арандуюць данае домаўладаньне цалкам, прычым яны ня маюць права павялічваць разьмеры арэндной платы.

5. Разьмер арэндной платы за зямельныя вучасткі на базарах, пляцох і іншых мясцох, якія адводзяцца для гандлёва-прамысловых і складачных мэт, а таксама для пабудовы часовых гандлёвых складачных памяшканьняў ня можа быць вышэй разьмеру арэндной платы, вызначанай для аднолькавых гандлёва-складачных памяшканьняў і ня ніжэй ставак зямельнай рэнты, вызначаных для зямельных вучасткаў, занятых пад гандлёва-складачныя памяшканьні.

6. Арэндная плата ўносіцца арандатарамі памяшканьня штомесячна не пазьней 25-га числа бягучага месяца.

За пратэрмінаваньне аплаты можа спаганяцца пеня ў разьмеры ня больш 1-3 проц. пратэрмінаванага да плаціжу сумы за кожны пратэрмінаваны дзень.

Калі арэндная плата ня будзе ўнесена на працягу аднаго месяца ад дня тэрміну ўплаты, дык адтэтык можа ўзьняць іск аб скасаваньні дагавору.

7. Гэта пастанова не пашыраецца на гандлёва-прамысловыя і складачныя памяшканьні і пляцы, якія знаходзяцца пад веданьнем НК шляху, у палосе адчужэньня чыгунак, а таксама на хладзільнікі, збожжа-элеватары, збожжа-лабазы, склады пад масланасеньне, фураж і крупяныя культуры, пад чым-бы ведамам яны не знаходзіліся.

8. Гэта пастанова набывае моц з 1 мая 1933 г.

9. Гарадзкія саветы і раённыя выканаўчыя камітэты выдаюць адпаведныя пастановы аб стаўках арэндной платы за гандлёва-прамысловыя, складачныя памяшканьні і пляцы, якія арандуюцца для гандлёва-прамысловых і складачных мэт, выходячы з асноўных ставак, і падстаў, прадугледжаных гэтай пастановай.

10. З выданьнем гэтай пастановы скасоўваецца пастанова ЦВК і СНК БССР «Пра парадак аддачы ў арэнду і аплаты будынкаў, памяшканьняў і пляцоў, якія арандуюцца для гандлёва-прамысловых і складачных мэт» (З. З. БССР 1928 г., № 38, арт. 363 і 1930 г. № 11, арт. 77).

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ЧАРВЯКОЎ.
Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

СЛУХАЙЦЕ! СЛУХАЙЦЕ!

ГАВОРЫЦЬ МЕНСК

УВАГА!

Усім Райвыканкомам, Гарсаветам, сельсаветам, райгазэтам, МТС, адбітак—Райпарткомам і Палітаддзелам МТС.
Усім загадчыкам радыёвузлоў, упаўнаважаным камітэту Радыёвяшчаньня.

10 ліпеня ў 22 гадз. па Маскоўскаму часу цвк ссср

арганізуе

УСЕСАЮЗНУЮ РАДЫЁПЕРАКЛІЧКУ,

прысьвечаную

конкурсу на лепшы па рабоце сельскі савет,

праз перадатчык РЦЗ на хвалі 1875 мэтраў.

З дакладам аб задачах саветаў ва ўборачнай і загатоўчай кампаніі выступіць старшыня ЦВК СССР М. І. КАЛІНІН.

Райвыканкомы абавязаны забясьпечыць маёмае слуханьне радыёперакліччі ў рабочых, калгасных клюбах, домах сацкультуры, МТС, саўгасах, калгасах і ўсіх калектывах.

У парадку пастановы СНК БССР ад 1 ліпеня 1933 г. № 955 на тэрыторыі БССР з 15-га чэрвеня па 15-е ліпеня 1933 г. праводзіцца пераўлік зброі.

Усім грамадзянам, якія маюць зброю, у тым ліку і паляўнічую нарэзную, за выключэньнем: членаў і кандыдатаў ЦК, членаў ЦКК, членаў ЦВК СССР і БССР, членаў СНК, членаў калегій наркаматаў, сакратароў РК КП(б)Б, старшыень РВК і гарсаветаў,—належыць разам з гэткай зьявіцца ў мясцовы орган ДПУ на перарэгістрацыю — у раёнах у райаддзяленьні, у гарадох — у гараддзяленьні АДПУ. У г. Менску — у камэндатуру ПП АДПУ па БССР — вакно № 5.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ
СЭКТАР КНІГАГАНДЛЮ
ВЫШЛА З ДРУКУ
і разаслана на месцы
БЛЁК-НОТ АГІТАТАРА № 15 (30)
11 ліпеня. Да дня вызваленьня Беларусі ад белапалякаў (Агітмасаддзел ЦК КП(б)Б). Стар. 40, тыр. 5.000.—1933 г. Ц. 20 к.
ПАТРАБУЙЦЕ ва ўсіх кнігарнях і кіёсках ДВБ, ВАКТ'у, РСС, Саюздруку.

Гомельскі вучэбны камбінат грамадзкага харчаваньня
абвяшчае
АСЕНЬНІ НАБОР:
а) у тэхнікум на аддзяленьні: тэхналёгічнае і тэхнармовчнае;
б) у ФЗВ куліняраў.
У тэхнікум і ФЗВ прымаюцца рабочыя, калгаснікі, служачыя і іх дзеці, узростам ня ніжэй 16 год. з адукацыяй ня ніжэй семігодкі ў тэхнікум і ня ніжэй 5-ці груп семігодкі у ФЗВ.
Іспыты для паступаючых будуць 1-га верасьня.
Жадаючыя паступіць у тэхнікум або ФЗВ павінны падаць заяву і даведкі аб узросьце, асьвеце, сацыяльным і матэрыяльным становішчы (свае і бацькоў), аб здароўі, і засьведчаную анкету.
Залічаныя забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам на агульных падставах.
Заявы прымаюцца штодзенна (акрамя выхадных 6, 12 і г. д.), ад 10 да 3 гадзін у канцылярыі камбінату—Гомель, Ляшчынская, 4.
ДЫРЭКЦЫЯ.

На падставе пастановы прэзыдыуму БКС ад 14-IV—33 г.
ЗАКРЫТЫ СТУДЭНЦКІ КААПЭРАТЫЎ
РЭАРГАНІЗУЕЦЦА.
Установы, прадпрыемствы і асобы, маючыя пратэнзіі, могуць прад'яўляць іх ліквідкому ЗСК да 15 ліпеня 1933 г.
Пасьля ўказанага тэрміну пратэнзіі прыняцца ня будуць.
Адначасова даводзіцца да ведама былых працаўнікоў ЗСК, што да 15-VII неабходна атрымаць аблігацыі.
Пасьля паказанага тэрміну аблігацыі будуць перададзены ашчадкасе № 100, як абязьлічаныя.
Ліквідком ЗСК.

Менскі гарпрафсавет разам з МГРК
9 ліпеня 1933 г. роўна а 7-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні залі пасяджэньняў гарпрафсавету (Пляц Волі)
СКЛІКАЕЦЦА
НАРАДА
СТАРШЫНЬ ЗАЎКОМАЎ, РАБАЧКОМАЎ і МЯСЦКОМАЎ
прадпрыемстваў, якія прымацаваны для абслугоўваньня да кром МГРК.
На нараду павінны зьявіцца ўсе старшыні каапбюро і крамкамісій МГРК.
З прычыны важнасьці пытаньня яўка абавязкова і без спазьненьня.
Менскі Гарпрафсавет, Праўленьне МГРК.

АНОНС! АНОНС!
Гатымі дняні новы гуказы гаварашчы фільм
ЗДАНЬ, ЯКАЯ НЕ ЗВАРАЧАЕЦЦА
У ГАЛ. РОЛЯХ:
заслуж. артыст ШТРАУХ, О. ЖЫЗЬНЕВА, ФУРДЫНАЙДАЎ, Кара-ДЗЬМІТРАЎ.

Чырвоная Зорка Каса—ад